WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 ЛІСТАПАДА 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 225
(26583)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Сёння ў Мінску адбудзецца Міждзяржаўны савет Еўразійскага эканамічнага супольніцтва (ЕўрАзЭС),

на якім кіраўнікі дзяржаў-удзельніц гэтага супольніцтва абмяркуюць пытанні па фарміраванні Мытнага саюза, а таксама адзінай эканамічнай прасторы. Учора ў сталіцу Беларусі прыбылі Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон, Прэзідэнт Кыргызстана Курманбек Бакіеў, Прэзідэнт Арменіі Серж Саргсян. Сёння ў Мінск прыбывае Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў.

БЕЛТА.

Прамая лінія

Якім будзе адрас дапамогі?

Новыя ўмовы атрымання адраснай сацыяльнай дапамогі, падтрымка інвалідаў, а таксама ўсе «пенсійныя пытанні» — гэта стане тэмай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ**. Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе **8 снежня з 11 да 12 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 21 і 292 38 92**. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары **287 17 57**.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЛІЧЫЦЬ СВОЕЧАСОВЫМ НА ВЫШЭЙШЫМ УЗРОЎНІ Ў АБСЕ АБМЕРКАВАЦЬ МІЖНАРОДНЫ ПАРАДАК ДНЯ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што настаў час на вышэйшым узроўні ў рамках АБСЕ абмеркаваць актуальныя пытанні міжнароднага парадку дня. Аб гэтым ён заявіў на сустрэчы з Прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым у Мінску.

Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускай дзяржавы павіншаваў Нурсултана Назарбаева з выбраннем у якасці старшыні ў 2010 годзе ў АБСЕ. «Мы рады, што ўпершыню краіна СНД старшынствуе ў АБСЕ», — сказаў ён, падкрэсліўшы, што Беларусь падтрымлівае ўсе казахстанскія ініцыятывы. «Ініцыятыва аб тым, што на вышэйшым узроўні ў рамках АБСЕ час абмеркаваць актуальныя пытанні міжнароднага парадку дня, з'яўляецца як ніколі важнай», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што гэты візіт казахстанскага калегі ў Беларусь будзе асабліва насычаны.

Беларусь і Казахстан вызначаць стратэгію эканамічнага супрацоўніцтва да 2012 года. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў. Паводле яго слоў, у ходзе сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам прэзідэнты абмеркавалі ўвесь спектр адносінаў дзвюх краін, у тым ліку рэгіянальнае супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне на міжнароднай арэне. «Вы заўсёды падтрымлівалі ініцыятывы Казахстана, наша старшынства ў АБСЕ», — адзначыў Нурсултан Назарбаеў, назваўшы гэты афіцыйны візіт знакавым у двухбаковых адносінах Беларусі і Казахстана.

Прэзідэнт Казахстана ўпэўнены, што эканамічнае супрацоўніцтва, якое знаходзіцца ў цэнтры ўвагі ў ходзе візіту, з'яўляецца базай для развіцця адносінаў і ў іншых сферах. «Паміж нашымі дзяржавамі няма нявырашаных праблем, мы адкрыты для супрацоўніцтва», — сказаў ён. Прэзідэнт Казахстана заявіў аб зацікаўленасці яго краіны ў супрацоўніцтве з Беларуссю па такіх напрамках, як хімічная прамысловасць, вытворчасць калійных угнаенняў. Таксама Казахстан мае патрэбу ў сучаснай беларускай сельскагаспадарчай тэхніцы, абнаўленні станковага парку ў сувязі з праводзімай у краіне індустрыялізацыяй. Нурсултан Назарбаеў таксама адзначыў зацікаўленасць у развіцці ваеннага і гуманітарнага супрацоўніцтва з Беларуссю.

Фота БЕЛТА.

Гаворачы аб маючым адбыцца пасяджэнні Міждзяржсавета ЕўрАзЭС, якое пройдзе ў Мінску 27 лістапада і на якім плануецца падпісаць асноватворныя дакументы аб стварэнні Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі, Нурсултан Назарбаеў падкрэсліў, што гэта гістарычная падзея і ў перспектыве Мытны саюз павінен трансфармавацца ў адзіную эканамічную прастору.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, на сустрэчы ў вузкім складзе з Нурсултанам Назарбаевым у дачернай і адкрытай гутарцы быў дэталёва абмеркаваны ўвесь спектр пытанняў беларуска-казахстанскага супрацоўніцтва. «Асабліва важна сённяшняя сустрэча напярэдадні сапраўды гістарычнай падзеі, да якой мы даволі доўга, але мэтанакіравана ішлі», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі, маючы на ўвазе плануемае падпісанне дакументаў, якія пакладуць пачатак Мытнаму саюзу Беларусі, Казахстана і Расіі.

Прэзідэнт Беларусі выказаў упэўненасць, што ў выніку сённяшніх перагавораў таксама будуць вызначаны новыя стратэгічныя вектары ўзаемадзеяння, якія дадуць магчымасць паспяхова процістаяць негатыўным з'явам сусветнага крызісу і іншым выклікам сучаснасці. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «Беларусь і Казахстан дастойна вытрымліваюць гэты няпросты этап», і краінам таксама ўдалося ў гэтых складаных умовах захаваць упэўненасць у сваіх партнёрах. «Сёння ў двухбаковых адносінах Беларусі і Казахстана няма супярэчнасцяў і праблемных пытанняў», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі пераканаены, што дзве краіны абсалютна правільна выбралі ключавы вектар развіцця сувязяў — стварэнне сумесных вытворчасцяў канкурэнтаздольнай прадукцыі, што выпускаецца на аснове перадавых тэхналогій. Так, за апошнія гады ў Казахстане арганізаваны сумесныя зборачныя вытворчасці трактароў, збожжаўборачных камбайнаў, паўпрычэпаў, прэс-падборшчыкаў, ліфтаў. Ужо ў гэтым годзе створаны новыя сумесныя прадпрыемствы па вытворчасці мэблі, малочных прадуктаў.

Казахстанскаму боку ў пачатку лістапада быў перададзены пакет канкрэтных беларускіх прапаноў у Карту індустрыялізацыі Казахстана. У пакет уключаны пераважна доўгатэрміновыя вытворчыя праекты, якія захопліваюць самыя розныя сферы: агракомплекс, машынабудаванне, горназдабыўную прамысловасць, энергетыку, металаапрацоўку, будаўнічую індустрыю, медыцыну, транспарт, хімію, інфармацыйныя тэхналогіі.

На заканчэнне Прэзідэнт Беларусі асабліва падкрэсліў, што Казахстан быў і застаецца для нашай рэспублікі надзейным стратэгічным партнёрам у Цэнтральнай Азіі. «Мы гэта высока цэнім і гатовы садзейнічаць падтрыманню інтарэсаў Казахстана ў еўрапейскім рэгіёне», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў запрасіў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку наведаць Казахстан з візітам у 2010 годзе і прыняць удзел у нефармальнай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў 18 снежня гэтага года. Такую прапанову ён зрабіў у час сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы ў пашыраным фармаце.

Прэзідэнт Казахстана падкрэсліў, што з іх боку ёсць рашучасць узняць на абсалютна новы ўзровень адносіны паміж Беларуссю і Казахстанам.

Кіраўнік казахстанскай дзяржавы, гаворачы аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве дзвюх краін, адзначыў павелічэнне тавараабароту за апошнія 10 гадоў у 13 разоў. У гэтым годзе з-за ўплыву сусветнага крызісу ўзровень гандлю крыху знізіўся. Аднак, на думку Прэзідэнта Казахстана, краінам удасца выправіць сітуацыю. Ён таксама з задавальненнем канстатаваў, што ўсе дасягнутыя раней дамоўленасці знаходзяць сваё практычнае прымяненне.

Нурсултан Назарбаеў надае важнае значэнне падпісанаму Плану сумесных мерапрыемстваў на 2010—2011 гады па рэалізацыі Праграмы эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Казахстанам на 2009—2016 гады. Ён уключае найбольш эфектыўныя праекты па супрацоўніцтве ў сферы машынабудавання, сельскай гаспадаркі, хіміі і іншых. Прэзідэнт Казахстана таксама звярнуў увагу на важнасць супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, навукова-тэхнічнай, сельскай гаспадаркі, культуры, на міжрэгіянальным узроўні. Нурсултан Назарбаеў паведаміў, што Казахстан гатовы павялічыць пастаўкі збожжа беларускаму боку.

Беларусь і Казахстан прынялі «Дарожную карту» двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва на 2010—2011 гады. Гэта падрабязны план сумеснай работы на сярэднетэрміновую перспектыву. Падпісанне дакумента адбылося ў Мінску ў прысутнасці прэзідэнтаў дзвюх краін пасля завяршэння іх перагавораў.

Бакі таксама падпісалі пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне аховы здароўя і медыцынскай навукі, вытворчай і навукова-тэхнічнай кааперацыі, а таксама аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным узаемадзеянні на міжрэгіянальным узроўні.

Акрамя таго, падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам фінансаў Беларусі і Агенцтвам па рэгуляванні і нагляду фінансавага рынку і фінансавых арганізацый Казахстана.

Прэзідэнты Беларусі і Казахстана таксама прынялі сумесную заяву. Бакі падкрэслілі важнасць паслядоўнага развіцця інтэграцыйных працэсаў на шматбаковай аснове і выпрацоўкі адзіных падыходаў да дзейнасці ў рамках СНД, ЕўрАзЭС, Мытнага саюза, АДКБ. Беларусь і Казахстан падтрымліваюць ідэю правядзення Саміту АБСЕ ў 2010 годзе з улікам неабходнасці сур'ёзнага аналізу сучаснай ролі і будучага гэтай арганізацыі ў шырокім кантэксце бяспекі і супрацоўніцтва, адаптацыі АБСЕ да новых выклікаў і сучасных рэалій.

Бакі дамовіліся садзейнічаць больш цеснаму супрацоўніцтву дзвюх дзяржаў як у рамках інтэграцыйных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы, так і ў вядучых міжнародных арганізацыях, у мэтах стабільнага развіцця і эканамічнага працвітання.

Акрамя таго, Беларусь і Казахстан маюць намер паглыбляць двухбаковае супрацоўніцтва, сканцэнтраваўшы намаганні на развіцці новых форм эканамічнага партнёрства, у тым ліку ўзаемнага прыцягнення інвестыцый і сучасных тэхналогій, вытворчай кааперацыі, узаемным удзеле прадпрыемстваў абедзвюх дзяржаў у міжнародных і рэгіянальных эканамічных праектах, што рэалізуюцца на тэрыторыі дзвюх краін. Бакі дамовіліся ўключыць сумесныя праекты з удзелам беларускіх прадпрыемстваў у распрацоўваемую Карту індустрыялізацыі Казахстана на 2010—2014 гады з прыняццем неабходных рашэнняў для іх рэалізацыі.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Прэзідэнт падзякаваў кіраўніцтву Міжнароднага саюза электрасувязі за аказаны Беларусі давер

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падзякаваў кіраўніцтву Міжнароднага саюза электрасувязі за аказаны Беларусі давер у плане выбару нашай краіны месцам правядзення Рэгіянальнага падрыхтоўчага сходу для краін СНД да Сусветнай канферэнцыі па развіцці электрасувязі 2010 года. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы сказаў на сустрэчы з генеральным сакратаром МСЭ Хамадунам Турэ.

«Перш за ўсё хачу падзякаваць за той давер, які саюз аказаў Беларусі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы абяцалі вам правесці гэта мерапрыемства дастойна. І сёння я бачу па вашых вачах, што Беларусь не падвяла Міжнародны саюз электрасувязі».

У сваю чаргу Хамадун Турэ сказаў: «У мінулым годзе мы з вамі марылі аб гэтай сустрэчы. І я рады, што гэтыя мары ажыццявіліся». Паводле слоў госця, дзякуючы намаганням беларускага кіраўніцтва на мерапрыемствы Міжнароднага саюза электрасувязі, якія праходзяць у Мінску, удалося прыцягнуць лідараў краін СНД, што садзейнічае развіццю міжнароднага ўзаемадзеяння ў сферы камунікацый. Пры гэтым генеральны сакратар канстатаваў вялікі прагрэс, дасягнуты Беларуссю ў галіне тэлекамунікацый.

Гэтыя міжнародныя мерапрыемствы праходзяць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Хамадун Турэ лічыць, што «памяшканняў такога ўзроўню няма больш нідзе ў Еўропе».

БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

СЯМЕЙНЫ КАРАБЕЛЬ АДПЛЫВАЕ!

Шлюбная пара на прыступках ЗАГСа Маскоўскага раёна сталіцы.

Супраць крызісу — у рамках СНД

Распрацоўка сумесных мераў дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па пераадоленні наступстваў сусветнага фінансавага крызісу стала адным з галоўных пытанняў на пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў СНД, якое адбылося на мінулым тыдні ў Ялце.

Як адзначыў **старшыня выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД Сяргей ЛЕБЕДЗЭЎ,** на пасяджэнні быў зацверджаны адпаведны план, які дазволіць больш актыўна выкарыстоўваць нацыянальныя валюты краін СНД ва ўзаемаразліках па экспартна-імпартных аперацыях, ліквідацыі міждзяржаўных бар'ераў ва ўзаемным гандлі таварамі і паслугамі, сумеснай абароне ўнутраных рынкаў нашых краін. Акрамя гэтага, план прадугледжвае канкрэтныя прапановы, якія накіраваны на забеспячэнне высокай ступені празрыстасці і адкрытасці фінансава-гаспадарчай дзейнасці шляхам абмену інфармацыяй аб цэнавым рэгуляванні, аб стане канкурэнцыі на таварных рынках і іншае. Таксама на пасяджэнні была распрацавана і зацверджана Канцэпцыя супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц СНД у сферы энергетыкі і ў галіне эксплуатацыі міждзяржаўных ліній электрапередач нацыянальных электраэнергетычных сістэм. Апошняе, у прыватнасці, павінна істотна аблегчыць транзіт электраэнергіі праз тэрыторыі суседніх дзяржаў краін СНД.

Сяргей Лебедзеў адзначыў, што план першачарговых мерапрыемстваў канцэпцыі ў сферы энергетыкі плануецца падпісаць на наступным пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў краін СНД 21 мая наступнага года ў Маскве.

Сяргей КУРКАЧ.

НАРАДЖЭННЯЎ БОЛЬШ ЗА ЎСЁ Ў СТАЛІЦЫ

Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у сёлетніх студзені—кастрычніку ў Беларусі нарадзілася 92,6 тысячы дзяцей — на 2 тысячы больш, чым за аналагічны перыяд летась.

Як паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення па рабоце з карыстальнікамі статыстычнай інфармацыяй Алена Кандраценка, найбольшая колькасць дзяцей сёлета нарадзілася ў сталіцы (17997 чалавек), Брэсцкай (14603), Гомельскай (14430) і Мінскай (13938) абласцях. Прыкметна адстаюць па гэтым паказчыку Віцебшчына і Гродзеншчына (па 10619 выпадкаў нараджэння), а таксама Магілёўшчына (10409).

Пры гэтым за студзень—кастрычнік у краіне было зарэгістравана 69234 шлюбы — на 4,1 працэнта больш, чым за аналагічны перыяд летась. А вось колькасць разводаў, наадварот, зменшылася на 4,7 працэнта — з пачатку года ў Беларусі распаліся 28377 сем'яў.

Яшчэ адзін цікавы нюанс — невялікае (на 0,2 тысячы чалавек) скарачэнне смяротнасці. Разам з тым яе паказчык па-ранейшаму перавышае нараджальнасць — усяго за студзень—кастрычнік у краіне памерлі 111,3 тысячы чалавек. Такім чынам, натуральнае дэмаграфічнае сальда зноў адмоўнае. Адно, што «мінус» у значнай ступені зменшыла міграцыя: на сталае месца жыхарства ў Беларусь прыбыў 16551 чалавек, тады як выехалі з нашай краіны 6448 чалавек.

Сяргей ГРЫБ.

БЕЛАРУСЬ — І Ў РАСІІ БЕЛАРУСЬ!

На шостым пасяджэнні Аб'яднанай калегіі міністэрстваў юстыцыі дзяржаў-удзельніц Саюзнай дзяржавы Аляксандр Канавалаў, Міністр юстыцыі РФ, папрасіў у беларускага боку прабачэння за сваіх калег, якія ў службовай перапісцы і расійскіх нарматыўных актах называюць нашу краіну Беларусіяй:

— Я хачу, па-першае, папрасіць прабачэння за супрацоўнікаў Міністэрства юстыцыі, якія ў перапісцы з Міністэрствам юстыцыі Беларусі і іншымі яе афіцыйнымі органамі ўжывалі альбо памылкова, альбо з-за неразумення няправільнае найменне. Надалей я гатовы гарантаваць і прашу сваіх калег падрыхтаваць распараджэнне па міністэрстве пра безумоўнае захаванне правільнай тэрміналогіі ў нашай перапісцы; па-другое, я абяцаю, што ва ўсіх нарматыўна-прававых актах, якія праходзяць адпаведную экспертызу ў Міністэрстве юстыцыі Расіі, надалей гэтае пытанне будзе вырашана, і няправільная назва вашай краіны будзе з'яўляцца падставай для вяртання акта на дапрацоўку. Акрамя таго, я мяркую, што будзе правільна, калі Міністэрства юстыцыі РФ падрыхтуе неабходны ліст у Адміністрацыю прэзідэнта РФ для таго, каб змяніць састарэлыя ведамасныя акты Адміністрацыі прэзідэнта наконт ужывання гэтай тэрміналогіі, — сказаў Аляксандр Канавалаў і дадаў, што няправільнае ўжыванне назвы — гэта ні ў якім разе не пагарда да братняй дзяржавы і не вялікадзяржаўны шавінізм, а проста гістарычная звычка.

Таксама падчас Аб'яднанай калегіі міністэрстваў юстыцыі дзяржаў-удзельніц Саюзнай дзяржавы было абмеркаванае пытанне пра ўзаемнае ўнясенне аднак аб заключэнні ці скасаванні шлюбаў у пашпарты грамадзян РБ і РФ. Каб палегчыць жыццё грамадзянам нашых дзвюх краін, што ўступаюць у шлюб, яшчэ на мінулай Аб'яднанай калегіі было прынятае рашэнне, каб нашы ўрады абмяняліся адпаведнымі нотамі, тым самым дазволіўшы беларускім дзяржаўным органам ставіць адзнакі аб шлюбе ў расійскія пашпарты і наадварот. На сёння расійскі бок выканаў усе свае ўнутрыдзяржаўныя працэдуры ў гэтым кірунку, справа засталася толькі за беларускімі парламентарыямі — на 30 лістапада намечана слуханне па гэтым пытанні ў Палаце прадстаўнікоў. Як падкрэсліў Віктар Галаванаў, Міністр юстыцыі Беларусі, гэтае пытанне ўжо было абмеркаванае на пасяджэнні профільнай камісіі ў Палаце прадстаўнікоў, дэпутаты падтрымалі яго адзінагалосна. Дарэчы, па звестках Міністэрства юстыцыі Расіі, штогод каля 3 тысяч расійскіх грамадзян бяруць шлюб з беларускамі грамадзянамі, а па звестках адпаведнага міністэрства РБ, у нас каля 17—20 % шлюбаў заключаецца паміж беларусамі і расіянамі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

белагропромбанк
традиции будущего

С 01 декабря 2009 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 20.11.2009 № 187, **размер ставки рефинансирования устанавливается в размере 13,5 процента годовых.**

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает о снижении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006, и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006, на 0,5 процентных пункта с 01.01.2010.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136
время работы 8.00-22.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ
звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, MTC) -
по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь

ТРЫ НЕЗАРЭГІСТРАВАНЫЯ СТРЭЛЬБЫ, ТРЫ СТРЭЛЬБЫ САМАРОБНЫЯ...

Дзяржінспектарамі з Полацкай міжрайінспекцыі і супрацоўнікам Полацкага РАУС у домаўладанні грамадзяніна з вёскі Светлічышча Полацкага раёна сапраўды быў знойдзены цэлы арсенал зброі. І не толькі ён. Непрацуючы гаспадар не меў дзяржаўнага пасведчання на права палявання. Тым не менш у яго былі знойдзены і канфіскаваны тры незарэгістраваныя паляўнічыя гладкаствольныя стрэльбы, тры самаробныя стрэльбы, выраблены з металічных трубак, самаробныя прыклады з дрэва. А таксама 13 кілаграмаў мяса дзіка і дзве тушкі дзікай норкі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У АБАРАЧЭННІ — «ВАДАЛЕЙ»

Нацыянальны банк Беларусі з сённяшняга дня ўводзіць у абарачэнне памятныя манеты «Вадалей» серыі «Знакі задыяка».

Сярэбраная манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925, масу 28,28 грама, медна-нікелевая — намінал 1 рубель. На адваротным баку сярэбранай манеты ў цэнтры размешчана стылізаваная выява Вадалея ў абрамленні геаметрычнага арнаменту з устаўкай з сінтэтычнага крышталя. Манеты адчаканены на АТ «Манетны двор Польшчы»: сярэбраная — якасцю «анцыркулейтэд, аксідзіраваная», медна-нікелевая — якасцю «брыльянт-анцыркулейтэд». Тыраж срэбнай манеты — да 25000 штук, медна-нікелевай — 10000 штук.

Ігар ГРЫШЫН.

МЯНЯЙЦЕ ПАРОЛЬ!

У міліцыю горада Баранавічы пачалі паступаць заявы ад карыстальнікаў высокахуткаснага інтэрнэту byfly. Людзі скардзіліся, што невядомыя карыстаюцца інтэрнэтам ад іх імя і на іх грошы.

Было вызначана, што пацярпелыя не змянялі пароль доступу да byfly і пакінулі той, які выдаваўся ім пры заключэнні дагавора. А гэта давала магчымасць хакерам карыстацца чужым трафікам. Амаль усіх зладзеяў удалося выявіць — гэта жыхары Мінска, Бярозы, Гомеля.

Тут прыцягвае ўвагу адзін момант. Калі майстры з «Белтэлекама» падключалі да byfly мяне, то не папярэдзілі, што неабходна пасля іх адыходу змяніць пароль. Добра, што сам здагадаўся.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ШКОЛЬНІКІ ПІЛЬНАВАЛІ ПЕНСІЯНЕРАК

Спачатку няпоўнагадовыя высочвалі ахвяраў, а пасля ў пад'ездах сталічных дамоў нападалі на іх, каб завалодаць сумкамі пацярпелых.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, серыя рабаўніцтваў з кастрычніка гэтага года рэгістравалася ў Маскоўскім раёне сталіцы. Так, жанчыны вярталіся з крамы дадому, купіўшы там прадукты, а ў пад'ездзе ў іх незнаёмцы выхоплівалі з рук пакеты з набытым таварам. Намаганні праваахоўнікаў далі плён: у выніку аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў удалося затрымаць двух падазроных, як выявілася, школьнікаў — юнакамі 12 і 16 гадоў. Старэйшы ведаў тыпавыя коды дамафонаў некаторых пад'ездаў і мог пранікаць у пад'езд раней за ахвяру. Раней гэты юнак ужо «засвяціўся» на рабаўніцтве пенсіянеркі: летась ён, едучы на веласіпедзе, вырваў з рук старой сумку з прадуктамі. Сёлета да «справы» злачынца прыцягнуў малодшага...

Ігар ГРЫШЫН.

«ПАЗЫЧАЮЦЬ» МЁД З ВУЛЛЯЎ І БУЛЬБУ СА СКЛЕПА

Да жыхара вёскі Сінкевічы Лунінецкага раёна зладзеі залезлі ноччу і панеслі два мяхі бульбы і мяшок камбікорму. А ў вёсцы Палонск Пружанскага раёна зламыснік пакінуў пчолаў без зімовага запасу: з вулляў ён выцягнуў 18 кілаграмаў мёду. Калі ў першым выпадку за крадзеж былі затрыманы непрацуючыя вяскоўцы, то мёд украў 15-гадовы падлетак, вучань мясцовай школы.

Яна СВЕТАВА, Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БЛЭРА АПАВЯСЦІЛІ АБ АДСУТНАСЦІ ЗМЗ У ІРАКУ ЗА 10 ДЗЁН ДА ПАЧАТКУ ВАЙНЫ

За 10 дзён да ўварвання ў Ірак Тоні Блэр атрымаў інфармацыю разведкі аб тым, што ў Садама Хусейна няма неадкладнага доступу да зброі масавага знішчэння. Аб гэтым на публічных слуханнях у Лондане, прысвечаных прычынам пачатку іракскай кампаніі, заявіў сэр Уільям Эрман, які кіраваў у той час дэпартаментам па разведцы і абароне брытанскага МЗС, паведамляе The Times.

У справаздачы, пададзенай Блэру, гаварылася, што, мяркуючы па ўсім, хімічная зброя знаходзілася ў разабраным стане, і Хусейн не аддаваў загаду яго збіраць. Акрамя таго, выказвалася здагадка, што ў Ірака няма дастатковай колькасці боегаловак для выкарыстання хімічнага ўзбраення.

РАСІЙСКІЯ ПАМЕЖНІКІ ЗАСТРЭЛІЛІ ЎКРАІНЦА

У ноч на 26 лістапада на расійска-ўкраінскай мяжы быў забіты грамадзянін Украіны. Яго застрэлілі расійскія памежнікі.

Паводле версіі расійскага боку (які праінфармаваў аб здарэнні праваахоўныя органы Украіны), гэты чалавек спрабаваў незаконна перасячы мяжу на аўтамабілі «Ніва» з прычэпам. Паведамляецца, што ён хацеў кантрабандай правезці ў Харкаўскую вобласць «абсталяванне для плаўсродкаў». Памежнікі зрабілі папераджальны стрэл, але парушальнік, паводле іх слоў, не адрэагаваў. Наступным стрэлам украінец быў паранены ў шыю. Раненне сталася смяротным.

У ЭСТОНІІ ЭКС-СТАРШЫНЮ САЮЗА АБАРОНЫ ДЗЯЦЕЙ АБВІНАВАЦІЛІ Ў ПЕДАФІЛІІ

У Эстоніі былога кіраўніка Саюза абароны дзяцей Каўра Хансана абвінавацілі ў згвалтаванні непаўналетніх і здымках порнафільмаў. Аб гэтым паведамляе Novosti.err.ee са спасылкай на Eesti Ekspress. Пасяджэнне суда па гэтай справе адбылося на мінулым тыдні. Хансан, як стала вядома, быў затрыманы больш як паўгода таму — у сакавіку 2009 года. Аднак у прэсу інфармацыя аб абвінавачваннях у яго адрас, трапіла толькі цяпер.

СТУДЭНТ АДКРЫЎ СТРАЛЬБУ Ў ВЕНГЕРСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

Адзін чалавек загінуў у выніку стральбы, якую адкрыў 23-гадовы мужчына ва ўніверсітэце горада Печ на паўднёвым захадзе Венгрыі, паведамляе партал Caboodle.hu са спасылкай на інфармагенцтва MTI. Інцыдэнт адбыўся 25 лістапада ў будынку Інстытута біяфізікі.

Паводле словаў прадстаўніка мясцовай паліцыі, як мінімум тры чалавекі былі параненыя, прычым адзін з іх знаходзіцца ў крытычным стане. Як распавёў афіцыйны прадстаўнік універсітэта, раненні атрымалі студэнт, выкладчык і прыбіральшчыца. Імя стралка невядомае, аднак ён ужо арыштаваны паліцыяй. Забойцам быў студэнт аддзялення фармакалогіі.

У КАРЭІ АДМЯНІЛІ ПАКАРАННЕ ЗА СПАКУШЭННЕ АБЯЦАННЕМ АЖАНІЦЦА

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Карэя прызнаў антыканстытуцыйным закон, які прадугледжвае крымінальнае пакаранне для мужчыны, што спакусіў жанчыну з дапамогай абяцання ажаніцца з ёй, паведамляе агенцтва «Ёнхап».

Паводле карэйскіх законаў, мужчына, які паабяцаў ажаніцца, каб дамагчыся ад жанчыны згоды на інтымныя адносіны, рызыкаваў атрымаць да двух гадоў турэмнага зняволення або штраф у 4300 долараў. Натуральна, пакаранне было магчымае, калі спакуснік не выконваў свае абяцанні.

У 2008 годзе па артыкуле аб ілжывым абяцанні ажаніцца ў Паўднёвай Карэі былі асуджаныя 25 чалавек, пры гэтым 8 з іх былі прысуджаныя да пазбаўлення волі.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.11.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 740,00
▲ 1 еўра	4 128,08
1 латвійскі лат	5 832,27
1 літоўскі літ	1 197,87
1 чэшская крона	158,18
1 польскі злоты	1002,95
▼ 1 расійскі рубель	94,89
1 украінская грыўня	344,01

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	28,8751
UAH	36,1164
1000 BYR	10,5345
EUR	43,5523

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Ордэнам Маці ўзнагароджаны 11 жанчын з Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей

Яны ўдастоены ўзнагарод у адпаведнасці з падпісаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь указам № 561.

У ліку ўзнагароджаных — хатняя гаспадыня з Віцебска Ірына Семерыкова, жывёлавод сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Азяранскі» Мастоўскага раёна Ганна Шарсцянкіна, інструктар Краснапольскага раённага цэнтра культуры і вольнага часу Аліна Арлоўская.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У БЕЛАРУСІ ПАКУЛЬ НЕ БУДЗЕ КІРЫЛІЦКІХ ДАМЕНАЎ

Аб гэтым паведаміў міністр сувязі і інфарматызацыі Беларусі Мікалай Панцялей, перадае карэспандэнт БЕЛТА. Як паведамлялася раней, у Расіі ўжо зарэгістраваны першы кірыліцкі дамен — Расія.рф. Мікалай Панцялей адзначыў, што цяпер у Беларусі не плануецца праводзіць такую работу. «Наша галоўная задача — стварыць якасны беларускі кантэнт, і мы будзем працаваць у гэтым напрамку». У Беларусі рэалізуецца праграма «Электронны ўрад». «Інтэрнэт-партал ужо створаны, але мы не да канца вырашылі праблему бяспекі інфармацыйных рэсурсаў. Таму ён пакуль не для шырокага доступу», — расказаў Мікалай Панцялей. Дзве трэці інтэрнэт-трафіку Беларусі ідзе ў Расію. «Мы спрабуем максімальна забяспечыць патрэбнасці грамадзян дзвюх дзяржаў у інфармацыі. Ужо трэці раз павялічваем знешні шлюз для доступу ў інтэрнэт».

Міністр сувязі і масавых камунікацый РФ Ігар Шчагалёў у сваю чаргу дадаў, што Беларусь і Расія актыўна працуюць па стварэнні лічбавага тэлебачання. УП «Белтэлекам» плануе ў снежні гэтага года пашырыць знешні інтэрнэт-шлюз Беларусі да 24 Гбіт/с. Шлюз у расійскім напрамку збіраюцца пашырыць да 20 Гбіт/с, у еўрапейскім — да 4 Гбіт/с. Цяпер прапускная здольнасць знешняга шлюза рэспублікі складае 17 Гбіт/с.

Абзац

◢ Як падлічылі сіноптыкі, у другой дэкадзе лістапада працягласць сонечнага ззяння ў Мінску склала ўсяго адну гадзіну. У першай дэкадзе месяца сонца ззяла над сталіцай 13 гадзін. Цыклоны і атмасферныя франты абумоўліваюць у Беларусі пахмурнае з дажджамі надвор'е з тэмпературай, вышэй за норму на 6—8 градусаў.

◢ МЗС Беларусі пацвердзіў факт забойства супрацоўніка «Беларуснафты» ў Венесуэле. Загінулы працаваў перакладчыкам і прысутнічаў на перамовах паміж нафтавым холдынгам «Petroleos de Venezuela» і ВА «Беларуснафта». Па версіі венесуэльскай газеты «El Tiempo», інцыдэнт адбыўся 24 лістапада. Раніцай перакладчык і двое яго знаёмых чакалі транспарт на гарадской вуліцы. Да іх падышлі невядомыя, двойчы стрэлілі ў супрацоўніка «Беларуснафты», забралі ў яго ноўтбук і зніклі. Ад атрыманых раненняў 35-гадовы грамадзянін Беларусі памёр у клініцы. Паведамляецца, што вядзецца пошук забойцы.

◢ Крымінальная справа распачатая КДБ краіны ў дачыненні да трох грамадзянаў — дырэктара ААТ «Медпласт» (Гомель) і жыхароў Мінска. Яны падазраюцца ў тым, што ў змове скралі не менш за 130 тыс. еўра з інавацыйнага фонду канцэрна «Белнафтахім». Сёлета вясной на «Медпласце», які падначалены «Белнафтахіму», праводзіўся конкурс па закупцы тэхналагічнага абсталявання — балонаў для транспарціроўкі і захоўвання вокісу этылену. Перамогу ў конкурсе атрымала кіпрская фірма, якая прапанавала абсталяванне па цане, завышанай у 4 разы. Менавіта з ёй і быў заключаны кантракт на суму, большую за 290 тыс. еўра. Нягледзячы на тое, што абсталяванне не адпавядала тэхнічным характарыстыкам, грошы за яго былі пералічаныя, частка з іх — не менш за 130 тыс. еўра — апынулася пасля на рахунках афшорнай структуры і была скрадзеная.

◢ Міліцыя распачала крымінальную справу ў дачыненні да трох магіляўчанак, якія не расплаціліся ў барах на суму больш за Br500 тыс. Тры непрацуючыя жыхаркі горада (дзве 19-ці і адна 24 гадоў) заказалі ў бары столік для святкавання дня народзінаў адной з іх, зрабілі сур'ёзную замову з дарагім віном, гарэлкай і закуссю. Перад закрыццём бара дзяўчаты выйшлі з бара пакурыць, пакінуўшы на стале сумачку, і зніклі, не расплаціўшыся. Толькі дзякуючы таму, што ў бары вяліся відэаназіранне і відэазапіс, супрацоўнікі міліцыі знайшлі амаратак пагуляць задарма. Вядзецца следства.

◢ У полацкую міліцыю 25-гадовая мясцовая беспрацоўная жыхарка заявіла, што нехта з яе кватэры скраў камп'ютарнае абсталяванне. Страту ацаніла ў тры мільёны рублёў. Высветлілася, што тэхніку скраў чалавек, які здымаў у яе кватэру. У дачыненні да 27-гадовага раней судзімага несумленнага жыльца ўзбуджана крымінальная справа. Скрадзенае, на жаль, не знайшлі.

Поўны абзац

◢ У расійскім Кузбасе судовыя прыставы арыштавалі пяцімесячнае кацяня пароды сфінкс. Яны прыйшлі ў кватэру да жыхара пасёлка Металпляцоўка Кемераўскай вобласці, які не аплаціў паслугі ЖКГ у суме 15 тыс. рублёў. Акрамя жывёлінкі, у даўжніка апісалі тэлевізар і DVD-прайгравальнік. Прыстаў-выканаўца папярэдне ацаніў кацяня ў 1 тыс. рублёў. «Калі гаспадары не выплацяць доўг, жывёліну выставяць на таргі», — адзначаюць ва Упраўленні федэральнай службы судовых прыставаў РФ па Кемераўскай вобласці. Тым не менш кацяня пакуль здадзенае на адказнае захоўванне гаспадару.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ДРУГОЕ СЕРАБРО Ў КАРЭІ

Беларус Сяргей Лагун (да 85 кг) заваяваў учора серабро ў суме дваябор'я на чэмпіянаце свету па цяжкай атлетыцы, які праходзіць у Паўднёвай Карэі.

Па выніках двух практыкаванняў беларус падняў 380 кг (171 кг у рыўку і 209 кг у штуршку). Золата выйграў чэмпіён Алімпіяды-2008 кітаец Лу Йон, які набраў суму 383 кг. У гэтай жа катэгорыі Беларусь не выставіла сярэбранага прызёра Алімпіяды-2008 і ўладальніка сусветнага рэкорду Андрэя Рыбакова, які застаўся дома з-за хваробы і траўмы.

Медаль Лагуна ў суме дваябор'я стаў другім для беларускай каманды на чэмпіянаце свету ў Паўднёвай Карэі. Раней серабро заваявала бронзавая медалістка Пекіна-2008 Настасся Новікава, якая нядаўна перайшла ў больш цяжкую вагавую катэгорыю да 58 кг.

«ЧЭЛСІ» І «БАРДО» БЕЗ ЗБОЯЎ

У матчах серады Лігі чэмпіёнаў англійскі «Чэлсі» і французскі «Бардо» атрымалі чарговыя перамогі над супернікамі і забяспечылі сабе месца ў плей-оф. Кампанію ім склаў, нягледзячы на паражэнне, партугальскі «Порту».

Вынікі матчаў 25 лістапада: група А: «Бардо» — «Ювентус» — 2:0, «Баварыя» — «Макабі Х» — 1:0; група В: «Манчэстэр Юнайтэд» — «Бешыкташ» — 0:1, ЦСКА — «Вольфсбург» — 2:1; група С: «Рэал» — «Цюрых» — 1:0, «Мілан» — «Марсель» — 1:1; група D: «Порту» — «Чэлсі» — 0:1, «АПАЭЛ» — «Атлетыка» — 1:1.

ДАПАМОГА ДЛЯ ДВАЙНЯТ

У нашай сям'і нядаўна нарадзіліся двайняты. Дапамогі на дзяцей прызначылі па месцы маёй працы. Па рашэнні камісіі выканкама нашы дзеці забяспечваюцца бясплатнымі прадуктамі харчавання. Я чуў, што ёсць яшчэ дапамога, якая прадастаўляецца на пагашэнне жыллёвых крэдытаў, толькі вось мы жыллё пакуль што не будуем і ў чарзе не стаім. Магчыма, ёсць і яшчэ якая дапамога, падкажыце.

Андрэй, *Гродзенская вобласць*.

Сапраўды, у ліпені Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь была прынята пастанова № 985 ад 27.07.2009 г. «Аб аднаразовай выплаце сем'ям пры нараджэнні дваіх і больш дзяцей на набыццё дзіцячых рэчаў першай неабходнасці».

Гэтай пастановай вызначана, што ў выпадку нараджэння дваіх і больш дзяцей сем'ям робіцца выплата на набыццё дзіцячых рэчаў першай неабходнасці на кожнае дзіця ў памеры двухразовай найбольшай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва за два апошнія кварталы перад датай нараджэння дзяцей.

Гэты бюджэт на перыяд з 1 лістапада 2009 года па 31 студзеня 2010 года складае 250 070 рублёў (пастанова Савета Міністраў № 1360 ад 20.10.2009), а раней, на перыяд з 1 жніўня па 31 кастрычніка 2009 года, складаў 249 410 рублёў (пастанова Савета Міністраў № 984 ад 27.07.2009).

Пад нараджэннем дваіх і больш дзяцей разумеецца нараджэнне дзяцей у шматплодных родах, гэта значыць, двайнят, трайнят і да т.п.

Вы, як бацькі дзяцей, маеце права на атрыманне гэтай выплаты да дасягнення дзецьмі ўзросту шасці месяцаў. Права на выплату таксама маюць усынавіцелі, апекуны дзяцей. Яны могуць атрымаць выплату на працягу шасці месяцаў з дня усынаўлення (удачарэння) дзяцей, устанаўлення над імі апекі.

Для атрымання выплаты вам або вашай жонцы трэба звярнуцца з заявай у орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне выканаўчага і распарадчага органа па месцы вашага жыхарства.

Заява падаецца па вызначанай форме. Пры сабе трэба мець пасведчанні аб нараджэнні дзяцей, дакументы, што сведчаць вашу асобу, а таксама пажадана, каб былі і копіі гэтых дакументаў. Копіі будуць засведчаны подпісам і пячаткай кіраўніка органа па працы, занятасці і сацыяльнай абароне без якой-небудзь платы за гэта.

Рашэнне аб выплаце прымаецца ў тэрмін не пазней за 10 дзён з дня прыёму заявы. У выпадку адмовы пра гэта паведамляецца заяўніку ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця такога рашэння з указаннем падстаў для адмовы і парадку абскарджання.

Аднаразовая выплата робіцца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў у дадатак да дапамог, што выплачваюцца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» (организатор аукциона)

по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит повторный аукцион по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для их обслуживания

На аукционные торги выставляются:

9 декабря 2009 г. в 11.00

ЛОТ № 1 Сведения о предмете аукциона

Капитальное строение (инв. № 610/С-44326) и право заключения договора аренды земельного участка, одноэтажное здание водостанции 21/4 с двумя пристройками, общей площадью – 139,0 кв.м, 1934 г/п (года постройки), стены и перегородки кирпичные, перекрытие деревянное. Подведены инженерные коммуникации. Объект расположен по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Чаловской, 90 (военный городок № 21) на земельном участке площадью 0,3207 га. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с нахождением в зоне санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения. Срок аренды земельного участка 25 лет. Условия использования: использовать земельный участок для обслуживания здания с возможным изменением направления его использования в установленном порядке.

Начальная цена предмета аукциона: 52 663 065 рублей (в т.ч.: объекта – 45 282 025, права заключения договора аренды земельного участка 7 381 040). **Размер задатка** – 5 000 000 рублей.

Продавец имущества (лот № 1): Государственное учреждение «Борисовское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (Минская область, г. Борисов, ул. Л. Чаловской, 26, тел. (80177) 73 33 49,75 76 59). **Арендодатель земельного участка (лот № 1):** Борисовский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Борисов, ул. Чапаева, 6).

ЛОТ № 2 Сведения о предмете аукциона

Капитальное строение (инв. № 640/С-42188) и право заключения договора аренды земельного участка. Одноэтажное здание пилорамы (инв. № 11/186), общей площадью 151,7 кв.м, 1966 г/п, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные. Инженерные коммуникации отсутствуют. Объект расположен по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Социалистическая, военный городок № 11, на земельном участке площадью 0,6242 га. Срок аренды земельного участка 16 лет.

Начальная цена предмета аукциона: 61 338 365 рублей (в т.ч.: объекта – 8 660 635, права заключения договора аренды земельного участка –52 677 730). **Размер задатка** – 6 000 000 рублей.

ЛОТ № 3 Сведения о предмете аукциона

Капитальное строение (инв. № 640/С-22823) общей площадью 1817,7 кв. м, 1979 г/п – трехэтажное здание учебного корпуса под общежитие13/207 с террасой, стены и перегородки панельные, перекрытия ж/бетонные. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43315) – электрическая сеть к зданию инв. № 13/207, протяженностью 210,0 м, рабочее напряжение 0,4 кВ. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43308) – водопроводная сеть от ВК-6 до здания инв. № 13/207, протяженностью 10,95 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43309) – тепловая сеть от ТК-5 до здания инв. № 13/207, протяженностью 7,55 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43327) – канализационная сеть от здания инв. № 13/207, протяженностью 4,50 м. Право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,2913 га. Срок аренды земельного участка 70 лет. Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 13 в/г.

Начальная цена предмета аукциона: 461 133 408 рублей (в т.ч.: объектов – 399 214 818, права заключения договора аренды земельного участка – 61 918 590). **Размер задатка** – 46 000 000 рублей.

ЛОТ № 4 Сведения о предмете аукциона

Капитальное строение (инв. 640/С-22799) общей площадью 286,8 кв.м, 1984 г/п – одноэтажное здание санчасти инв. (№ 13/218), стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43323) – электрическая сеть к зданию инв. № 13/218, протяженностью 50,0 м, рабочее напряжение 0,4 кВ. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43307) – водопроводная сеть от ВК-9 до здания инв. № 13/218, протяженностью 5,50 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43311) – тепловая сеть от ТК-6 до здания инв. № 13/218, протяженностью 8,75 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43325) – канализационная сеть от здания инв. № 13/218, протяженностью 48,90 м. Право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,1924 га. Срок аренды земельного участка 34 года. Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 13 в/г.

Начальная цена предмета аукциона: 91 372 410 рублей (в т.ч.: объектов – 68 017 580, права заключения договора аренды земельного участка – 23 354 830). **Размер задатка** – 9 000 000 рублей.

ЛОТ № 5 Сведения о предмете аукциона

Капитальное строение (инв. № 640/С-22839) общей площадью 1008,6 кв.м, 1938 г/п – одноэтажное здание кухни-столовой № 13/7, с террасой и складом, стены и перегородки кирпичные оштукатуренные, перекрытия – сборно железобетонное. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43314) – электрическая сеть к зданию инв. № 13/7, протяженностью 65,0 м, рабочее напряжение 0,4 кВ. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43303) – водонапорная сеть от ВК-16 до здания инв. № 13/7, протяженностью 27,9 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С- 43310) – тепловая сеть от ТК-3 до здания инв. № 13/7, протяженностью 6,0 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43324) – канализационная сеть от здания инв. № 13/7, протяженностью 105,6 м. Право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,4973 га. Срок аренды земельного участка 13 лет. Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 13 в/г.

Начальная цена предмета аукциона: 97 746 258 рублей (в т.ч.: объектов – 67 904 838, права заключения договора аренды земельного участка – 29 841 420). **Размер задатка** – 9 500 000 рублей.

ЛОТ № 6 Сведения о предмете аукциона

Капитальное строение (инв. № 640/С-22802), общей площадью 3212 кв.м, 1936 г/п – трехэтажное здание казармы, стены и перегородки кирпичные, перекрытия ж/бетонные. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43313) – электрическая сеть к зданию инв. № 13/69, протяженностью 60,0 м, рабочее напряжение 0,4 кВ. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43305) – водопроводная сеть от ВК-15 до здания инв. № 13/69, протяженностью 65,70 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43312) – тепловая сеть от ТК-4 до здания инв. № 13/69, протяженностью 7,30 м. **Капитальное строени**е (инв. № 640/С-43326) – канализационная сеть от здания инв. № 13/69, протяженностью 70,50 м. Право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,3504 га. Срок аренды земельного участка 27 лет. Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 13 в/г.

Начальная цена предмета аукциона: 191 297 511 рублей (в т.ч.: объектов – 155 821 591, права заключения договора аренды земельного участка – 35 475 920). **Размер задатка** – 19 000 000 рублей.

Продавец имущества (лоты №№ 2-6): Государственное учреждение «Бобруйское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» Слуцкий филиал (Минская область, г. Слуцк, ул. Богдановича, 184, тел. (801795) 6 69 70). **Арендодатель земельных участков (лоты №№ 2-6):** Слуцкий районный исполнительный комитет (Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 189).

Подробное извещение о проведении аукциона по лотам 1-6 опубликовано в газете «Звязда» от 7 октября 2009 г. № 189.

9 декабря 2009 г. в 12.00

ЛОТ № 1 Сведения о предмете аукциона

Капитальное строение (инв. № 614/С-26091) и право заключения договора аренды земельного участка. Одноэтажное здание пожарного депо, общей площадью 335,2 кв.м, 1955 г/п, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытие деревянное. Объект расположен по адресу: Минская область, Смолевичский район, пос. Черницкий, на земельном участке площадью 0,0899 га. Срок аренды земельного участка 99 лет. **Имеется обременение в виде договора аренды сроком до 2 августа 2010 года.**

Начальная цена предмета аукциона: 67 764 184 рубля (в т.ч.: объекта – 67 449 844, права заключения договора аренды земельного участка – 314 340). **Размер задатка** – 6 500 000 рублей.

ЛОТ № 2 Сведения о предмете аукциона

Капитальное строение (инв. № 614/С-26094) и право заключения договора аренды земельного участка. Одноэтажное здание электроцеха с пристройкой и навесом теневым, общей площадью 203,3 кв.м, 1956 г/п, стены и перегородки кирпичные. Объект расположен по адресу: Минская область, Смолевичский район, пос. Черницкий, на земельном участке площадью 0,0578 га. Срок аренды земельного участка 99 лет.

Начальная цена предмета аукциона: 22 438 477 рублей (в т.ч.: объекта – 22 236 377, права заключения договора аренды земельного участка – 202 100). **Размер задатка** – 2 000 000 рублей.

Продавец имущества (лоты №№ 1-2): Производственное республиканское унитарное предприятие «Красное Знамя» (222221, Минская область, Смолевичский район, пос. Черницкий, тел. (801776) 6 17 46). **Арендодатель земельных участков (лоты №№ 1-2):** Смолевичский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Смолевичи, ул. Советская, 125).

ЛОТ № 3 Сведения о предмете аукциона

Незавершенное законсервированное капитальное строение (инв. № 620/U-22892) и право заключения договора аренды земельного участка, общей площадью 5212,6 кв.м, готовность строения – 68 %, здание четырехэтажное, стены, перегородки и – ж/б панели, кирпич, перекрытия – ж/б плиты. Объект расположен по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, д. 1, на земельном участке 0,6794 га. Срок аренды земельного участка 99 лет.

Начальная цена предмета аукциона: 6 721 546 039 рублей (в т.ч.: объекта – 6 697 576 807, права заключения договора аренды земельного участка – 23 969 232). **Размер задатка** – 500 000 000 рублей.

Продавец имущества: Республиканское производственное унитарное предприятие «Борисовхлебпром» (222120, Минская область, г. Борисов, пр. Революции,78, тел. (801777) 76 20 43, 76 62 63). **Арендодатель земельного участка:** Дзержинский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Дзержинск, пл. Дзержинского,1).

ЛОТ № 4 Сведения о предмете аукциона

Капитальное строение (инв. № 631/С-13632), общей площадью 64,9 кв.м, 1977 г/п – одноэтажное здание специализированного, физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения медпункт со складом, стены бревенчатые, перегородки дощатые, перекрытие деревянное. **Капитальное строение** (инв. № 631/С-13634), общей площадью 402,7 кв.м, 1977 г/п – одноэтажное здание (спальный корпус) с четырьмя пристройками, погребом, навесом, фундамент бутовый, стены бревенчатые, перегородки дощатые, перекрытие деревянное. Проведены инженерные коммуникации (электроснабжение, водопровод, канализация). Имеются: беседка, эстрада, уборная, склад, колодец, емкость, дорожка, забор. **Капитальное строение** (инв. № 631/С-13827) – сооружение специализированного водоснабжения (скважина), глубина 53,0 м, надфильтровая часть длиной 47,0 м. Право заключения договора аренды земельного участка площадью 2,3918 га. Срок аренды земельного участка 50 лет. Объекты расположены по адресу: Минская область, Вилейский район, Осиповичский с/с, д. Холянино.

Начальная цена предмета аукциона: 58 920 858 рублей (в т.ч.: объектов – 58 295 600, права заключения договора аренды земельного участка – 625 258). **Размер задатка** – 5 500 000 рублей.

Продавец имущества: Министерство промышленности Республики Беларусь в безвозмездном пользовании открытого акционерного общества «Зенит-БелОМО» (222410, Минская область, г. Вилейка, ул. Чапаева, 26, тел. (801771) 3 99 76, 3 99 69). **Арендодатель земельного участка:** Вилейский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Вилейка, ул. Партизанская, 40).

Подробное извещение о проведении аукциона по лотам 1-4 опубликовано в газете «Звязда» от 7 октября 2009 г. № 189.

Задаток для участия в аукционе перечисляется в срок по 8 декабря 2009 года включительно на расчетный счет **№ 3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество».

Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленном аукционе и предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома: **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество» в разделах «Власть», «Управления и комитеты облисполкома».

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в срок по 30 декабря 2009 года включительно:

1. Внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения соответствующими исполнительными комитетами), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка.

2. Представить копии платежных документов, названных в пункте 1, организатору аукциона в течение 1 дня со дня оплаты.

Пэўна, не памылімся, калі скажам, што інавацыйныя праекты выключаюць у работніка] прадпрыемства павышаную цікавасць. Гэта такое своеасаблівае выпрабаванне прафесійных здольнасцяў. Так што імкненне працаваць «на інавацыйнай хвалі» — адна з адметных рысаў, што не можа не радаваць. Пакольк таксі падыход выглядае цалкам па-сучаснаму. Зразумела, можна б было заставацца ў даўно асвоеных межах, дзе ўсе добра цябе ведаюць і давяраюць табе. Але дзе ж тады перспектыва?

Пагадзіцеся, бездакорная рэпутацыя — ці не галоўны набытак для кожнага прадуцоўнага калектыву.

Надзвычай цікава было даведацца пра тое, як праектаваннем арганізацыі удалося спрацаваць у даволі складаны час. Як тут справа ладзіцца, над якімі праектамі працуюць зараз, чым увогуле жывуць работнікі? Пра гэта і не толькі мы вырашылі даведацца прама на месцы і накіраваліся ў Маладзечна, на ЗАТ «Будпраект».

Начальнік аддзела гвадзіці Аксана КАРОТЧЫК і яе намеснік Ігар КАПУСКІ.

Гэтыя фотаздымкі паказваюць, як выглядае сёння старая пабудова і як прапануюць спецыялісты-праекціроўшчыкі праекцыі рэканструкцыю. Свой унёсак у агульную працу робіць малады тэхнік Надзея БЯРЭЗІНА.

Гэтыя фотаздымкі занатавалі ў імгненні працоўнага дня групы выпускоў і камплектацыі. «Вось у такіх прыкосных перапынках мы «спрачаем» частку дакументацыі, — зазначыла інжынер Таццяна ГУЛЕВІЧ. Галоўны інжынер праектаў Алексей КУХТО атрымлівае ў надзвычайна вялікіх аб'ёмах электронны ўзор свайі распрацоўкі. У архіве, які даручана весці Надзеі ЯРМАЛІНСКАЙ, зарэгістравана больш за тры з паловай тысячы аб'ектаў.

Начальнік аддзела генплана Вольга СЫРАКВАШ, інжынеры Валянціна БАЧУРЫНА і Алена МОНІД працуюць над праектам індывідуальнай забудовы гарадскога пасёлка Фаніпаль.

Галоўны архітэктар Мікалай ГАПОН.

Начальнік кашторыснага аддзела Надзея ГАПОНЕНКА і інжынер Марыя КРЫВАШЗЯ.

У супрацоўнікаў ЗАТ «Будпраект» ёсць магчымасць правесці адпачынак у цікавых паездках па краіне і замежжы. Маладому інжынеру Марыі ВЯЛІЧКІ трывожна ўзгадаць пра нядаўнюю паездку ў Францыю.

У цэнтры Маладзечна расце-падрастае жылы будынак, дзе частка кватэр належыць працаўнікам ЗАТ «Будпраект».

Начальнік групы выпуску Лілія СТАШКЕВІЧ правяла паказаль на фотаздымку ўсю колькасць дакументацыі на адзін аб'ект, які знаходзіцца на штодзённым кантролі. Адзін з этапаў дакументацыі — распрацоўка пункта харчавання каля вёскі Краснае.

НА ПЯТЫМ ДЗЯСЯТКУ

Гісторыя закрытага акцыянернага таварыства «Будпраект», здаецца, не такая ўжо і вялікая — 41 год. Для чалавека гэта ўзрост творчых здзяйсненняў, важкіх прафесіяналізмаў, пэўнага досведу. Напэўна, усё гэта з упэўненасцю можна адзначаць і да працоўнага калектыву ЗАТ «Будпраект». Прадпрыемству за чатыры з лішкам дзесяцігоддзі свайго існавання давялося перажыць многае. У сярэдзіне 1960-х гадоў з'явілася неабходнасць патрабаваць даволі вялікага па плошчы рэгіёна. Варта ўзгадаць пра «старавальня ўмовы»: памыканне, плошчай 200 квадратных метраў і калектыў з 20 работнікаў, якія працавалі над пастаўленай глабальнай задачай. Цэлер нават ужэка сабе ўявіць цяжка. Вядома, невычайна складана было не скарыцца і выстаяць. «Будпраект» выстаяў і, відавочна, з гонарам прайшоў праз цмятлівіх выпрабаванні, якія для многіх іх калег сталі непераадольнымі. Напрыклад, «Мінсксельбудпраект» у тыя часы ўваходзіў адмоўваціца ад свайго маладзечанскага філіяла. Сталічны інстытут прадаў сваю частку будынка, але выручаных грошай хапіла ненадоўга — тыя сродкі разышліся за месяц. А вось для маладзечанскіх праекціроўшчыкаў настаў без усялякага перабольшвання час пстарычны разышэнні.

Мяркуйце самі: філіял насуперак цяжкасцям набыў самастойнасць і выразыў пазмагацца за сваё «месца ў пад сонцам». Гэта цэлер работнік «Будпраекта» ўзгадаюць той перыяд з цёплай усмешкай, але насамрэч было зусім не да ўсмешак. Сапраўднае выпрабаванне годнасці і характару, прафесійных якасцяў і усяго таго, што зугрупуюе каляктыў. Вядома, не абышлося без страты: тады колькасць работнікаў зменшылася больш чым у чатыры разы! Уяўляеце сабе сітуацыю?! Толькі упэўненыя ў сваіх сілах і магчымасцях людзі здольныя прайсці праз такія «гоні», вадну і медныя трубы (нанш, бадай, тут і не скажаш).

Цяперашні кіраўнік прадпрыемства Вольга Вялічка прыйшла сюды працаваць 21 год таму і добра памятае перыяд выпрабаванняў. Дарэчы, ідля яе, несумненна, гэта быў час выпрабаванняў і адказных рашэнняў. Пакольк праз пэўны час ад Вольгі Рыгораўны, як ад кіраўніка, многае залежала. У тым ліку і галоўнае, амаль што гамлетаўскае, пытанне: усё ж такі быць ці не быць самастойнаму, паспяховаму прадпрыемству? Правільна вырашаць такія пытанні, умець падбудаваная стратэгія і, безумоўна, упартая праца дазволілі дасягнуць сапраўдных вярхынь у сваёй працы. І пастаянна рухацца наперад. Як жа адчуваюць сябе цяпер, на пятым дзясятку?

— Пяты дзясятак пачаўся зусім нядрэнна, — заўважае Вольга Вялічка. — Адсвяткавалі 40-годдзе, але памятная дата — перш за ўсё падстава для таго, каб падвесці вынікі працы і не спыняцца на дасягнутым, а ўпэўнена рушыць да новых здзяйсненняў. Тут нельзя марудзіць, паколькі рынкавыя ўмовы даволі хорсткія і калі недзе «праспаў у шапку», то ўжо праз нерашэнні.

Мяркуйце самі: філіял насуперак цяжкасцям набыў самастойнасць і выразыў пазмагацца за сваё «месца ў пад сонцам». Гэта цэлер работнік «Будпраекта» ўзгадаюць той перыяд з цёплай усмешкай, але насамрэч было зусім не да ўсмешак. Сапраўднае выпрабаванне годнасці і характару, прафесійных якасцяў і усяго таго, што зугрупуюе каляктыў. Вядома, не абышлося без страты: тады колькасць работнікаў зменшылася больш чым у чатыры разы! Уяўляеце сабе сітуацыю?! Толькі упэўненыя ў сваіх сілах і магчымасцях людзі здольныя прайсці праз такія «гоні», вадну і медныя трубы (нанш, бадай, тут і не скажаш).

Цяперашні кіраўнік прадпрыемства Вольга Вялічка прыйшла сюды працаваць 21 год таму і добра памятае перыяд выпрабаванняў. Дарэчы, ідля яе, несумненна, гэта быў час выпрабаванняў і адказных рашэнняў. Пакольк праз пэўны час ад Вольгі Рыгораўны, як ад кіраўніка, многае залежала. У тым ліку і галоўнае, амаль што гамлетаўскае, пытанне: усё ж такі быць ці не быць самастойнаму, паспяховаму прадпрыемству? Правільна вырашаць такія пытанні, умець падбудаваная стратэгія і, безумоўна, упартая праца дазволілі дасягнуць сапраўдных вярхынь у сваёй працы. І пастаянна рухацца наперад. Як жа адчуваюць сябе цяпер, на пятым дзясятку?

— Пяты дзясятак пачаўся зусім нядрэнна, — заўважае Вольга Вялічка. — Адсвяткавалі 40-годдзе, але памятная дата — перш за ўсё падстава для таго, каб падвесці вынікі працы і не спыняцца на дасягнутым, а ўпэўнена рушыць да новых здзяйсненняў. Тут нельзя марудзіць, паколькі рынкавыя ўмовы даволі хорсткія і калі недзе «праспаў у шапку», то ўжо праз не-

Міхаіл БЯСЕДЗІН, Алеа ВЯЛІЧКА, Ганна САЎЧАНКА працуюць з высокакладкавым абсталяваннем для абследаванн будынкаў, якое дазваляе вымяраць з дапамогай лазернага промня, ультразвуку. У інфрачырвоным спектры вызначаюць недахопы цеплаізаляцыі сцен.

— Летась пераважная большасць праектных інстытутаў адмаўляліся ад заказаў, а мы іх браліі, — узгадвае Вольга Вялічка. — Зразумела, нагрузка значна павялічылася, аднак мы добра разумеем, што працуем на сябе, стараем уласны дабрабыт. Гэта вельмі важны момант, самадзейнае стымуляванне працуючыйнасці працы. Бы і цікава працаваць (дарэчы, менавіта вырашэнне цікавага пытання ў нашым выпадку і мяркуецца сярэдзіць больш чым на два дзясяткі. І рух у гэтым кірунку ўжо распачаўся. Да нас звярталіся два заказчыкі (сумесныя прадпрыемствы — беларуска-польскае і беларуска-літоўскае) накант магчымасці распрацоўкі адпаведных праектаў. Пакуль гэта толькі пагадненні перамовы, пакольк працэс узгаднення даволі працяглы. Аднак мяркуем узяцца за гэтую справу, хоць яна для нас зусім новая. Цяпер займаемся дакладным вывучэннем перспектыўнага кірунку, знаёмімся з перадавой замежнай практыкай.

Пагадзіцеся: а ўсё ж такі пакамплексныя ролікаў па радыё і тэлебачанні бясплатныя ўзгадаюцца прыклады замежных бізнэсменаў — сціпль пачатак і наступныя бліскучыя дасягненні. А, на нашу думку, ну чым ж горшая практыка ЗАТ «Будпраект» ад падвальнага «офіса» — да сотняў перспектыўных праектаў у самых розных галінах эканомікі. Усяго гэтага ўдалося дасягнуць за чатыры дзясяткі гадоў, дзе былі ўзлёты і падзенні, перамогі і цяжкасці, аднак заўсёды — рашучасць, ініцыятыва, пошук, імкненне да новых гарызонтаў. Менавіта ў гэтым і ёсць, напэўна, той самы сакрэт поспеху, стрыжань жыццядольнасці, дзякуючы якому ўсё і атрымалася як мае быць.

НА ХВАЛІ ІНАВАЦЫЙ

Кажучы пра тое, што на прадпрыемстве заўсёды адсочваюць літаральна ў «рэжыме рэальнага часу» ўсе тыя змены, якія адбываюцца ў эканоміцы, мы нікольі не перабольшвалі. Пакольк пошук перспектыўных заказаў (нават новых напрамкаў дзейнасці) — ці не галоўная задача для калектыву закрытага акцыянернага таварыства «Будпраект». Прычым задача з разраду стратэгічных, якая вызначае далейшую перспектыву, станоўчае развіццё. Менавіта таму мы вырашылі надаецца такая значная ўвага. У гэтым плане вельмі да месца вялікія аналітычныя якасці кіраўніка і бездакорныя прафесійныя здольнасці калектыву. У такім разе прадпрыемства працуе менавіта як згуртаваная каманда і здольнае на самыя высокія дасягненні.

— Як вядома, у нашай дзяржаве прынятая сур'ёзная дзяржаўная праграма па развіцці сеткі лагістычных цэнтраў, — адзначае Вольга Вялічка. — Адпаведная сістама мерапрыемстваў зацвярджана кіраўнікоў дзяржавы. Паколькі абраны кірунак ухвалены на такім узроўні, то гэта відавочна вызначае яго прыярытэтнасць. Актуальнае развіццё лагістычных цэнтраў — сусветная тэндэнцыя, тамусе стаўленне беларускіх уладаў цалкам апраўданае. Увогуле станоўчыя перспектывы развіцця айчыннай эканомікі шмат у чым вызначае менавіта навацыйны падыход. Так і з лагістычнымі цэнтрамі — паводле папярэдніх разлікаў, іх у Беларусі на працягу пэўнага часу мяркуецца стварыць больш чым два дзясяткі. І рух у гэтым кірунку ўжо распачаўся. Да нас звярталіся два заказчыкі (сумесныя прадпрыемствы — беларуска-польскае і беларуска-літоўскае) накант магчымасці распрацоўкі адпаведных праектаў. Пакуль гэта толькі пагадненні перамовы, пакольк працэс узгаднення даволі працяглы. Аднак мяркуем узяцца за гэтую справу, хоць яна для нас зусім новая. Цяпер займаемся дакладным вывучэннем перспектыўнага кірунку, знаёмімся з перадавой замежнай практыкай.

Пагадзіцеся: а ўсё ж такі пакамплексныя ролікаў па радыё і тэлебачанні бясплатныя ўзгадаюцца прыклады замежных бізнэсменаў — сціпль пачатак і наступныя бліскучыя дасягненні. А, на нашу думку, ну чым ж горшая практыка ЗАТ «Будпраект» ад падвальнага «офіса» — да сотняў перспектыўных праектаў у самых розных галінах эканомікі. Усяго гэтага ўдалося дасягнуць за чатыры дзясяткі гадоў, дзе былі ўзлёты і падзенні, перамогі і цяжкасці, аднак заўсёды — рашучасць, ініцыятыва, пошук, імкненне да новых гарызонтаў. Менавіта ў гэтым і ёсць, напэўна, той самы сакрэт поспеху, стрыжань жыццядольнасці, дзякуючы якому ўсё і атрымалася як мае быць.

УЛАЗІНЫ З ЗАДАВАЛЬНЕННЕЙ

Як ужо ўзгадвалася, дзяржаўная праграма па будаўніцтве жылля ў нашай краіне пастаянова рэалізуецца на працягу шэрагу гадоў. Не стала выключэннем і ўвасабленне ў жыццё сёлетніх плановых паказчыкаў. Мінская вобласць сярод бюджэтных падраяў жыллёвага будаўніцтва. Прычым тэмпы прыросту адпаведных аб'ёмаў у сталічным рэгіёне адзначаюцца з году ў год. А як вы думаеце, хто сярод асноўных праекціроўшчыкаў жылля на Мінсчыне? Зразумела, спецыялісты закрытага акцыянернага таварыства «Будпраект». Тамусе ў гэтым кірунку ўжо распачаўся. Да нас звярталіся два заказчыкі (сумесныя прадпрыемствы — беларуска-польскае і беларуска-літоўскае) накант магчымасці распрацоўкі адпаведных праектаў. Пакуль гэта толькі пагадненні перамовы, пакольк працэс узгаднення даволі працяглы. Аднак мяркуем узяцца за гэтую справу, хоць яна для нас зусім новая. Цяпер займаемся дакладным вывучэннем перспектыўнага кірунку, знаёмімся з перадавой замежнай практыкай.

Пагадзіцеся: а ўсё ж такі пакамплексныя ролікаў па радыё і тэлебачанні бясплатныя ўзгадаюцца прыклады замежных бізнэсменаў — сціпль пачатак і наступныя бліскучыя дасягненні. А, на нашу думку, ну чым ж горшая практыка ЗАТ «Будпраект» ад падвальнага «офіса» — да сотняў перспектыўных праектаў у самых розных галінах эканомікі. Усяго гэтага ўдалося дасягнуць за чатыры дзясяткі гадоў, дзе былі ўзлёты і падзенні, перамогі і цяжкасці, аднак заўсёды — рашучасць, ініцыятыва, пошук, імкненне да новых гарызонтаў. Менавіта ў гэтым і ёсць, напэўна, той самы сакрэт поспеху, стрыжань жыццядольнасці, дзякуючы якому ўсё і атрымалася як мае быць.

■ **Гісторыя закрытага акцыянернага таварыства «Будпраект», здаецца, не такая ўжо і вялікая — 41 год. Для чалавека гэта ўзрост творчых здзяйсненняў, важкіх прафесійных набыткаў, пэўнага досведу. Напэўна, усё гэта з упэўненасцю можна адзначаць і да працоўнага калектыву ЗАТ «Будпраект».**

■ **Пасяльніка арганізацыі тут не з'яўляюцца нейкім выключэннем — неабходна пастаянна пацвярджаць сваю дзеламбую рэпутацыю, пра штодзённую працу даказваць аўтарытэт. Кожны пралік «важкіць» заходзіць дарога і ўсе работнікі гэта добра разумеюць. І імкнуцца працаваць як мага лепш, павышаць свой узровень, удасканальваць. Гэта прадукцыйны шлях развіцця, які здольны прынесці пэўныя вынікі.**

УНП 600078283.

ЗАСПАКАЕННЕ НА ДЗВЕ ДУШЫ



НАЎРАД ці хто ў нас сумняваецца ў тым, што Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. Аднак амаль 20 гадоў таму акадэмік Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі даказаў, што геаграфічны цэнтр Еўропы сапраўды знаходзіцца ў нашай краіне. Некалькі краін прытэндуюць на тое, што гэты пункт на іх тэрыторыі — маюць рацыю, бо існуюць розныя метады даследавання. Але доказы беларускага геолага можа паўтарыць любы школьнік: ёсць прызнаны самы заходні пункт Еўропы, ёсць самы ўсходні, паўночны і паўднёвы, а на перакрыжаванні паралеляў і мерыдыянаў знаходзіцца беларуская Чыжаха, на рацэ Бярэзіне. Гэтае паведамленне на першым з'ездзе беларусаў свету зрабіла фурор, таму што тады на гэтую тэму шырока не гаварылі. Але зусім не дзіва, што ідэя даказаць гэта напаткала менавіта акадэміка Гарэцкага, які пераехаў жыць у Беларусь ужо дарослым чалавекам, бо вырас у Расіі, куды была выслана сям'я бацькоў. Яшчэ ў мінулым стагоддзі і раней яго родныя жылі з думкамі пра радзіму, за гэта і пацярпелі. Што за час гэта быў для Беларусі, можна даведацца з кнігі «Браты Гарэцкія». Яе аўтар разважае пра загадкі лёсу, які ўмее гуляць з людзьмі, народамі, краінамі.

— Яшчэ на пачатку XX стагоддзя Беларусь магла атрымаць надзею як краіна. Вашы родныя былі ўдзельнікамі гэтых працэсаў, марылі пра беларускую незалежнасць. Але мары не наражаюцца ніадкуль...

— У майго бацькі і дзядзькі было магутнае роднае карэнне. Іх маці была народнай спявачкай, сказальніцай, якая размаўляла на цудоўнай беларускай мове. Яна была непісьменная, але вельмі культурная ад прыроды, багатая на песні, фальклор, казкі. Культура ж ідзе не толькі ад адукацыі. Мой бацька казаў: крышталёвая паэзія матчыных песень і казак уплывала на іх так моцна, што яны па-сапраўднаму паслюбілі нашу родную зямлю і родную мову. Як казаў яшчэ Максім Гарэцкі: любіце нашу мову, любіце маці, якая першая навучыла вас размаўляць на роднай мове. Выдатна, што «Звязда», у якой ён працаваў, жыве гэтымі запаветамі. Усё жыццё Максім за мову стаяў. Асабліва калі быў у Вільні, то займаўся не толькі літаратурай, мовазнаўствам, але і палітыкай — быў членам прэзідыума рады БНР разам з В. Ластоўскім і А. Луцкевічам. Таму у іх таксама хапіла спрэчак: адны былі за Беларусь разам з палякамі, другія разам з расейцамі, а тут яшчэ і Саветы з'явіліся з вельмі прывабнымі лозунгамі... Але была і такая хваля: мы самі па сабе павінны быць. Да яе належаў і Максім Гарэцкі. Але сітуацыя змянілася. Ён мог застацца за межамі, калі палякі захапілі Вільню. Мог быць закатаваны яшчэ тады, але пратэсты людзей яго ўратавалі. І вырашыў вярнуцца на Радзіму. У нейкай ступені паверыў тым лозунгам, якія ствараліся бальшавікі.

— Напэўна, хацеў жыць на роднай зямлі?

— Так, ён жа не так лёгка трапіў у Беларусь. Яго не пускалі сюды, ён дабіваўся. Спецыяльна ездзіў у Варшаву, каб атрымаць пашпарт. Шмат намаганняў было прыкладзена дзеля таго, каб жыць на радзіме і размаўляць на сваёй мове. Гэта галоўнае для яго было ў жыцці. Тое самае перайшло і майму бацьку.

— Ён браў прыклад са старэйшага брата?

— Ён паважаў Максіма, лічыў яго настаўнікам. Максім на сем гадоў быў старэйшы, а ў тыя гады гэта розніца была істотная, іх аб'яднала духоўнае адзінства. Самае галоўнае ў характары Гаўрылы — ад Максіма. Ён і праўда быў вельмі моцны, вельмі прынцыповы, хоць і міккі.

— Напэўна, калі Максім зрабіў выбар на карысць Беларусі, то былі надзеі на тое, што будзе будавацца новае жыццё. Але яны расталі, калі пачаліся арышты. Максім Гарэцкі спрабаваў звярнуць увагу на крывадушнасць сістэмы...

— Ён першы пачаў пісаць аб гытым яшчэ ў «Дзвюх душах». Калі яны былі ў 1918 годзе ў Смаленску разам з Янкам Купалам, то сутыкнуліся з жудаснымі людскімі пакутамі. Тады друкавалі спісы — каго расстралялі, каго трэба расстраляць. А расстрэльвалі ж каго? Настаўнікаў, сялян, у якіх дзве каровы... Янка Купала казаў, што быў непрытомным у тым годзе ад гэтай жудасці. А лозунгі гучалі прывабныя... Максім з таго часу пачаў пра гэта пісаць і шмат чаго прадбачыў. У шэрагу апавяданняў ёсць моманты, дзе раскрываецца гэтая тэма. Такія людзі, як літаратары, шмат адчуваюць і шмат што прадчуваюць — успомніце Дастаеўскага «Бесы». Многія разумелі, што адбываецца, але не ўсе маглі і не баяліся пісаць.

— Кніжку «Браты Гарэцкія» вы стваралі дзеля таго, каб праз лёс родных паказаць сітуацыю, якая ў той час была ў краіне?

— Калі вызначыць жанр, то гэта дакументальная аповесць. Я хацеў, безумоўна, паказаць не толькі сям'ю нашу, але і ўсю сітуацыю, якая была ў XX стагоддзі. А яны якраз людзі XX стагоддзя. Я хацеў, каб было зразумела, што гэта не прыдумана, таму як мага больш паказаў дакументаў, якія каментаваў. Мой бацька выратаваўся, хоць яго да расстрэлу два разы прыгаворвалі. Максіму далі менш — пяць гадоў высылкі. Але потым яго расстралялі... Я хацеў разабрацца: чаму?

Мой бацька быў эканаміст, а па няволі ў высылцы стаў геолагам. У яго нібыта два жыцці. Ён нібыта ў кашулі нарадзіўся. Яго пасадзілі — нібыта ён Галадзеда і Чарвякова ў контррэвалюцыю ўцягнуў. Як злоснага ворага паслалі яго ў Маскву, а ў гэты час больш за тысячу чалавек, сярод якіх павінен быў быць бацька, расстралялі ва ўрочышчы Сандармах каля пасёлка Мядзвежая гара. Я там быў — вялікі манумент стаіць, не так, як у Курапатах. Такім чынам ён ураставаўся. Потым зноў пасадзілі. Тут мяняюць Ягоду на Берыю — яго выпусцілі. І трэці раз пашанцавала...

Калі мы жылі ў Расіі, то ён увесь час імкнуўся ў Беларусь. Яго не адпусціў генерал-маёр Жук, кіраўнік «Гідрапраекта», дзе бацька працаваў. Гэта ўжо пасля вайны, у 47-м годзе было. Хутчэй за ўсё, калі б ён прыехаў сюды, то яго б зноў пасадзілі — ішла чарговая хваля...

— У які час ваш бацька даведаўся пра смерць Максіма?

— На жаль, пра сапраўдную смерць ён так і не даведаўся. Дзядзьку забралі ў кастрычніку 37-га года. Леаніла Усцінаўна і Галіна Максімаўна — жонка і дачка Максіма Іванавіча — прывозілі розныя перадачы, яшчэ іх прымалі, ведаючы, што яго ўжо няма. Афіцыйна яны атрымалі паперу — у 39-м годзе перад самай вайной: «ваш муж памёр 20 сакавіка 1939 года ад крывазліцця ў мозг у пасёлку Важаэль Комі АССР». Ён быў у высылцы на Ухце. І мы можам узяць некаторыя энцыклапедыі, і знойдзем там гэтую дату. І мой бацька перад вайной пра гэта даведаўся. Усе мы так думалі. Іншых звестак не было. Але пасля таго, як пайшла перабудова, я меў магчымасць паглядзець яго «расстрэльную» справу, якую прыслалі са Смаленска.

— Каму і чым ён у Вязьме быў небяспечны — ужо ж выслалі?..

— Паглядзіце акт расстрэлу: на дранай паперы пазначана, што так званая «тройка» прыгаварыла расстраляць. Акт потым склалі. Там напісана, хто выконваў — ізноў тры чалавекі. Як гэта было? Вывелі 40 чалавек з турмы, адвялі на месца расстрэлу ў 14.45, а ў 15.00 прывялі прыгавор у выкананне. І трупы закапалі на адпаведную глыбіню. Гэта быў сапраўдны генацыд свайго народа. За 15 хвілін расстралялі 40 чалавек! Максім там 30-м значыцца. Разам з ім — селянін, рабочы, настаўнік... Проста людзі.

— Дзівіць настойлівасць вашага бацькі — ён жа вярнуўся на Радзіму зусім немаладым чалавекам.

— Яму было пад 70 гадоў, гэта быў залаты яго час, па вяртанні ў Беларусь. У Акадэміі навук аднавілі, папрацаваў яшчэ каля 20 гадоў, стварыў выдатную геалагічную школу. Гэта быў яго самы светлы час, калі ён працаваў на Радзіме.

Ён памёр у 1988 годзе. Мне вельмі крыўдна — бо гены ў нашым родзе моцныя: прапрадзед сто з гакам гадоў пражыў, дзед — 90 гадоў. Я заўсёды быў упэўнены, што бацька 90 пражыве. І ўвесь час яму казаў: сядай, напішы ўспаміны. Ён вельмі добра ведаў многіх пісьменнікаў, навукоўцаў, грамадскіх дзеячаў. Найцікавейшыя былі б успаміны! Але такое жыццё, што кожны пражыты год — ужо цуд.

Вельмі шкада, што бацька не дажыў да незалежнасці Беларусі, да таго часу, калі беларускую мову абвясцілі дзяржаўнай.

— Ён доўгія гады пражыў у Расіі, а беларускую мову не забыў?

— Ён так добра ведаў мову, што да гэтага часу многія ўспамінаюць, як ён прыгожа размаўляў. Ён па гаворцы мог вызначыць, з якой часткі Беларусі чалавек родам. Наогул ставіўся паважна да ўсіх моў. У Расіі на чыстай рускай мове гаварыў, з палякамі — па-польску, мог па-ўкраінску — там шмат працаваў, нямецкую ведаў. А ў Беларусі — толькі па-беларуску.

Але што да мяне, то калі нас выслалі, мне было 4 гады, і сюды я вярнуўся можна сказаць разам з бацькам амаль праз 40 гадоў. Я наогул ніколі беларускую мову не вучыў. Бацька з намі быў вельмі мала. Беларускую мову мы чулі ў сям'і толькі тады, калі бацька з маці паміж сабой размаўлялі. І калі лісты ад яго атрымлівалі. Уся мая моўная вучоба. Калі сюды прыехаў, патрошку пачаў далучацца да родных мовы.

— Адчулі ў гэтым патрэбу?

— Для бацькі і для Максіма самае галоўнае было — родная зямля і родная мова. Нездарма Максім і Гаўрыла Гарэцкія выдалі ў Смаленску першы расійска-беларускі слоўнік... Пра будучыню беларускай мовы яны дбалі ўсё жыццё.

Па спадчыне мне гэта перадалося. Мой маральны абавязак — пісаць пра іх. Мы кожны год праводзім Гарэцкія чытанні, пачалі са 100-годдзя Максіма Гарэцкага. Звярнуўся да яго твораў, вывучаў дакументы. Дзякуючы сваім блізкім я ведаю: калі да роднай зямлі далучаецца родная мова, узнікае вялікая роднасць людзей гэтай зямлі. У іх узбуджаецца самасвядомасць, яны робяцца сапраўднымі патрыётамі, і іх моц нераможная.

— Як у гэтым пераканаць іншых?

— На жаль, у мяне, можа з узростам, больш сумных думак. Я бываў у шмат якіх краінах Еўропы, быў у Амерыцы. Я там бачыў нашых беларусаў. Беларусы там двух тыпаў. На жаль, сучасная моладзь часта забывае і мову, і радзіму, ёю кіруе чыста камерцыйны дух. Але што мяне дзівіць: тут яны мову не ведаюць, а там умомант вывучаюць не толькі англійскую — і нарвежскую, і фінскую, і шведскую... Таму што ва ўсіх нармальных краінах без ведання мовы няма чаго рабіць. І ва ўсіх краінах першае, што ты павінен зрабіць — вывучыць мову. Чалавеку прапануюць пайсці на курсы, дзе ён вывучае мову, таму што яму немагчыма жыць без мовы той краіны. А калі гляджу на нашу Беларусь, то бачу: у нас немагчыма жыць без рускай мовы, а толькі з беларускай цяжка. Таму яна, на жаль, робіцца непатрэбнай нам. У якой краіне можна хадзіць па сталіцы і не пачуць ад чалавека роднага слова?.. У вёску раней прыязджаеш — жанчыны так па-беларуску прыгожа размаўлялі — я вельмі любіў ездзіць да бабуляў маёй жонкі. А цяпер жа і там няма былой прыгажосці і чысціні.

— Магчыма, ёсць нейкая надзея на тое, што стаўленне да беларускай мовы ў людзей зменіцца?

— Надзея — на інтэлігенцыю, на моладзь, на дзяцей. Але паглядзіце, колькі працэнтаў школьнікаў вучыцца па-беларуску: 18. Каб дзіця вучылася па-беларуску, трэба, каб бацькі пісалі заяву. Яшчэ Максім Гарэцкі пісаў: «Было б дзіўна і не разумна пытаць у расіяніна, ці хоча ён рускую мову ў школе. Глупства было б пытаць аб тым жа немца, француза, латыша ці эстонца. Чаму тады з дурнымі пытаннямі можна звярнуцца толькі да цёмнага беларуса?» Гэта ён у 19-м годзе пісаў, вельмі даўно...

Уся надзея на тое, што дзяржава зверне ўвагу на моўную сітуацыю. Бо няма краіны, калі ў яе няма мовы. Мяне вельмі хвалюе, што ЮНЕСКА запісала нашу мову ў выміраючыя. Лічыце — у Чырвонай кнізе моў. Калі не зменіцца палітыка дзяржавы ў стаўленні да мовы, то загіне мова — і загіне Беларусь. Бо калі няма беларускамоўных жыхароў, то няма краіны Беларусь.

Ларыса ЦІМОШЫК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.58	15.55	7.57
Віцебск —	7.54	15.39	7.45
Магілёў —	7.48	15.45	7.57
Гомель —	7.38	15.49	8.11
Гродна —	8.12	16.12	8.00
Брэст —	8.06	16.20	8.14

Месяц

Поўня ў 21.15.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Арцёма, Германа, Леаніда.*
К. *ДЗЯДЫ, Еўдакіі, Багдана, Тамаша.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

27 лістапада

1859 год — у эксплуатацыю ўведзена першая ў Беларусі тэлеграфная лінія Мінск — Бабруйск, адпраўлена першая тэлеграма з Мінска ў Бабруйск. Гэта дата стала Днём нараджэння электрасувязі ў Беларусі. У 1896 годзе ў Мінску пабудавана тэлефонная станцыя на 100 нумароў, на пачатку XX стагоддзя тэлефонныя станцыі былі ў 16 гарадах Беларусі, працавала каля 400 прадпрыемстваў пошты і тэлеграфа.

1874 год — у вёсцы Моталь (сёння Іванаўскі раён Брэсцкай вобл.) нарадзіўся Хаім Вейцман, палітычны і дзяржаўны дзеяч Ізраіля, вучоны-хімік, прафесар біялогіі. Выкладаў у Жэневскім, Манчэстарскім універсітэтах, узначальваў хімічную лабараторыю. Адзін з заснавальнікаў і першы прэзідэнт Дзяржавы Ізраіль (1948—52 гг.).

Цытата дня:

«Не ганіся за пахвальбой, але з усіх сілаў імкніся дзейнічаць пахвальна».

Ян Каменскі (1592—1670), чэшскі мысліцель-гуманіст.

ЗБОРЫ ЖАНІХА

Падрыхтоўка жаніха да ад'езду да нявесты суправаджалася шматлікімі рытуальна-магічнымі дзеяннямі і нагадвала старажытныя «ўзброеныя наезды, звязаныя са звычаямі выкрадання нявесты». У той жа час яны насілі прадуцыравальны (абсыпанне жытам) і ахоўны (напрыклад, чырвоны колер у адзенні жаніха і г.д.) характар.

● Памыўшыся крынічнай вадой, прынесенай з вечара, жаніх надзяваў адзенне, спецыяльна падрыхтаванае да вяселля. Звычайна гэта былі светлыя штаны і светлая кашуля з яркім арнаментам на грудзях і рукавах. Затым ён падпрэзваўся шырокім поясам з чырвоным арнаментам па краях. У вопратцы жаніха таксама прысутнічалі элементы чырвонага колеру: шапка, хуста з чырвоным бантам, чырвоны бант ці стужка на кажусе і г. д.

● Раніцай у дом да жаніха запрашалі самых блізкіх сваякоў: цётак, дзядзькоў, хросных бацькоў і г.д. Дачакаўшыся галоўных прадстаўнікоў сваёй радзіны, гаспадары распачыналі першапачатковы **абрад збірання жаніха**: яго садзілі на «пасад» — кош са збожжам жыта. У гэты момант хросная маці тройчы выстрыгала яму на патыліцы крыжападобна некалькі пасмаў валасоў.

● Сваты і дружкі маладога збіралі «падарожную валізку», якая будзе самым цудоўным чынам дапамагаць перамагаць «нечаканыя» перашкоды на шляху вясельнага картэжа і па дарозе да нявесты, і па дарозе дадому пасля вянчання. З сабой бралі некалькі пляшак гарэлкі, хатняе печыва, мёд, грошы, закуску для тых, хто будзе «лавіць зайца» — перагароджваць дарогу маладым.

● Калі ўсё было падрыхтавана да ад'езду, бацькі ставілі ў цэнтры хаты стол, засцілалі яго белым ільняным абрусам, ставілі вядро з вадой і запальвалі грамнічную свечку. Бацька браў саматканы ручнік, перавязваў ім рукі сына, тройчы абводзіў яго вакол стала і вёў да парога. Затым даваў яму ў рукі невялікі абраз з выявай Хрыста, а маці, трымаючы ў руках грамнічную свечку і хатні абраз, благаслаўляла сына ў дарогу. Абраз пакідалі дома, а «грамніцу» сват браў з сабой, каб перасцерагчы вясельны картэж у дарозе.

● Затым гасцей запрашалі за стол, гучалі пажаданні, спяваліся вясельныя песні. Усе разам выходзілі на вуліцу і сядалі ў вазы: на першы сядаў жаніх, хросныя бацькі, сваты, на наступны — сястра з елкай ці вясельным дрэўцам і хлебам-соллю, на астатнія вазы сядалі сваякі і дружкі жаніха, музыкі. Маці апранала на сябе вывярнуты на левы бок кажух і тройчы абыходзіла вясельны поезд, абсыпаючы яго жытам ці аўсом.

● На Беларусі меў месца і такі звычай, калі жаніх і нявеста ехалі ў царкву паасобку і да вянчання не сустракаліся. Звычайна такі «парадак» быў заведзены на вяселлях гарадской інтэлігенцыі каталіцкай канфесіі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Аўстралійскі фермер падышоў да сажалкі і ўбачыў, што ў ёй купаюцца голыя дзяўчаты. Тыя яго заўважылі і загарлапанілі:

— Валі адгэтуль, мы не выйдзем з вады, пакуль ты не пойдзеш!

Фермер:

— Здаліся вы мне. Я толькі хацеў пакарміць свайго кракадзіла.

☺

Не люблю прачынацца ад грубіянскіх будзільнікаў, люблю ад далікатных будзільнікаў!

☺

Бабуля выхоўвае ўнука:

— Андрэйка, калі кашляеш, трэба закрываць рот далонню.

— Не бойся, бабуля, у мяне зубы не вылецяць, як у цябе ў мінулы раз!

☺

Абвестка: «Навучэнка сельгастэхнікума дапаможа адзінокаму фермеру падняць гаспадарку».

ЗАЯВА

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже объекта государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества с установлением начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством

Наименование предмета аукциона	Железнодорожный путь и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., г. Дрогичин, ул. Ленина, 204
Продавец недвижимого имущества	РУПП «Экзон-Глюкоза», тел. 01644 3 10 25
Сведения о предмете аукциона	Железнодорожный путь – длина 9091 м, ширина колеи – 1520 м. Земельный участок площадью 5,6591 га (в т.ч. 3,1281 га и 2,5310 га), ограничения в охранных зонах линий электропередач, трубопроводов и иных инженерных сооружений, срок аренды – 25 лет
Условия аукциона	- осуществление покупателем предпринимательской деятельности на объекте не менее 3-х лет с даты заключения договора купли-продажи; - создание не менее 3 рабочих мест в течение одного года с даты заключения договора купли-продажи; - запрещение покупателю продажи, иного обеспечения объекта до выполнения им всех условий договора купли-продажи
Начальная цена предмета аукциона, руб.	25 857 444*
Сумма задатка, руб.	2 585 000
Организатор аукциона	**Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 20 87 85, 23 44 06, 23 12 63, www.brest-region.by**

* определена как сумма начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством, и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка. В случае изменения на дату проведения аукциона размера базовой величины начальная цена предмета аукциона корректируется с учетом изменения размера базовой величины.

Аукцион состоится **29 декабря 2009 года в 11.00** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2. К участию в аукционных торгах допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, представившие следующие документы:

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 28.12.2009 г. включительно;

негосударственным юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

негосударственным иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 28 декабря 2009 года включительно.

ЧАСОПІС ЯК АНЁЛ

Адзінаму дзяржаўнаму часопісу для жанчын «Алеся» — 85 гадоў

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Галоўны рэдактар часопіса Тамара БУНТО.

— Праўда, вельмі дзіўна, што жанчына альбо кабета з такім прыгожым жаночым імем мае такі шаноўны ўзрост? — кажа галоўны рэдактар выдання Тамара БУНТО. — Насамрэч, той, хто возьме часопіс у рукі, убачыць, што «Алеся» — маладая, прыгожая і сучасная сяброўка.

Рэдактар не проста хваліць «сваё дзіця», яна кажа праўду. Каб упэўніцца ў гэтым, дастаткова ўзяць у рукі любы нумар часопіса за гэты год. Напрыклад, на вокладцы апошняга, лістападаўскага, — першая віцэ-міс «Інтэркантыненталь» Марыя Есьман, а ўнутры — інтэрв'ю з гэтай прыгожай і разумнай, мэтанакіраванай студэнткай юрфака БДУ. І нягледзячы на тое, што нумар святочны, юбілейны, а значыць, напоўнены віншаваннямі, гістарычнымі спасылкамі, пажаданнямі і выказваннямі з гэтай нагоды, тут змешчаны і нарыс пра «Жанчыну года» — вядомага мецэната Наталлю Ільніцкую, дырэктара брэсцкага рынку «Кавалёва», і тэма ўзаемаадносінаў мужчын і жанчын у шлюбе, і экскурсія па сучасным чыгуначным вакзале ў Мінску, і аповед пра традыцыі вёскі Трушава, што на Піншчыне, і размова з псіхолагам пра «справы сардэчныя», і развагі пра такую тонкую і складную матэрыю, як мацярынская любоў, і матэрыял пра ўзаемаадносіны паміж сёстрамі-падлеткамі, і апавяданні чытачак, і паэтычны конкурс, і парады стылістаў, урачоў, дызайнераў, кветкаводаў, і, безумоўна, кулінарныя рэцэпты... Сапраўды, ёсць што пачытаць, што выкарыстаць у жыцці, і пра што падумаць жанчыне любога ўзросту.

Часопіс нарадзіўся ў 1924 годзе, тады яму далі імя «Беларуская работніца і сялянка». Часопіс без перабольшвання стаў любімым для многіх пакаленняў беларусак.

Часопіс некалькі разоў мяняў назву. З 1931 года і да Вялікай Айчыннай вайны «Беларуская работніца і сялянка» выходзіла як «Работніца і калгасніца Беларусі». А пасля Перамогі адрадзілася як «Работніца і сялянка» і насіла гэта імя амаль паўстагоддзя. У васьмідзясятыя гады тыраж часопіса дасягаў паўтара мільёна экзэмпляраў. Са студзеня 1995 года выданне носіць імя «Алеся».

— У адрозненне ад так званых «глянцавых часопісаў», наш дае нагоду для роздуму, для разваг, для працы душы, а яго гераіні і аўтары — рэальныя, звычайныя, нармальныя жанчыны, а не прыдуманыя альбо створаныя іміджмейкерамі. Гэта — паштальёнкі, вясковыя настаўніцы, бібліятэкаркі, даяркі, студэнткі. Гэта — нашы жанчыны і дзяўчаты. Якіх мы вельмі любім, ведаем, паважаем, пра якіх і для якіх выдаём часопіс, — кажа галоўны рэдактар.

— «Алеся» — часопіс і для розуму, і для душы, — кажа Зінаіда ВАЛОВІЧ, рэктар Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

— У будучыні часопіс стане яшчэ больш цікавы і змястоўны, — упэўнена намеснік начальніка ўпраўлення Міністэрства інфармацыі Валянціна МЯШЧЭРСКАЯ. — Задача Міністэрства, як заснавальніка часопіса, і рэдакцыйнага калектыву — пашырыць кола чытачоў і падпісчыкаў. Тут працуе высокапрафесійны калектыў і ёсць магутны рэзерв для развіцця.

У найбліжэйшых планах часопіса — стварэнне інтэрнэт-версіі, пашырэнне «псіхалагічных» і «практычных» старонак. Ну і, безумоўна, падпісчыц і чытачак «Алесі» чакае нямала сюрпрызаў, пра якія загадзя не расказваюць...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Ну і ну!

ЦЕШЧУ... АСУДЗІЛІ ЗА ДАНОС НА ЗЯЦЯ

У Лепельскім раёне асудзілі жанчыну, якая абвінавачвала свайго зяця ў тым, што ён быццам бы скраў з яе дома 100 тысяч рублёў. Насамрэч, як высветлілася, гэтага ён не рабіў. Цешчу пакаралі за беспадстаўны данос.

Як паведаміў «Звяздзе» **пракурор Лепельскага раёна Віктар ПАЛХОЎСКІ**, 46-гадовая жанчына спачатку расказвала следчым у Лепельскім раённым аддзеле ўнутраных спраў, што, маўляў, зяць узламаў уразны замок і трапіў у яе дом у вёсцы Старое Лядна. Там узяў 100 тысяч рублёў. Жанчыну адразу папярэдзілі пра крымінальную адказнасць за свядома беспадстаўны данос.

Як высветлілі следчыя, зяць не вінаваты ў крадзяжы. Цешча прызналася, што не любіць мужа сваёй дачкі. Маўляў, калі дачка пайшла за зяця замуж, «адразу ў мяне не склаліся з ім стасункі». Прасіла выканаць нейкую просьбу, дапамагчы па гаспадарцы — а ён нічога не рабіў.

Аднойчы цешча, скарыстаўшыся тым, што дачка і зяць збіраліся прыехаць да яе, каб забраць рэчы, якія ім належаць, заявіла ў міліцыю пра крадзеж. Была ўпэўненая, што зяця за крадзеж абавязкова пакараюць. І не пабаялася, што яе самую могуць асудзіць за данос...

Па прыгаворы суда яе прызналі вінаватай і аштрафавалі ў памеры 50 базавых велічыняў. Такім чынам, жанчына абавязана пералічыць на карысць дзяржавы 1 мільён 750 тысяч рублёў. Больш не будзе дарма скардзіцца на зяця?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

З днём народзінаў шчыра віншуем спадарыню **КУСЯНКОВУ** — знакамітую агародніцу, майстрыху, фотаГрафіню... Здароўя Вам, шаноўная Соф'я Парфір'еўна, спору і ладу ў працы, творчага натхнення і аптымізму!

Сябры з Мінска і Беразіна.

КАРЫКАТУРА — ГЭТА СУР'ЁЗНА

БЕЛЬГІЯ, Балгарыя, Францыя, Іран, Германія, Англія, Японія, Расія — вось далёка не поўны спіс краін, якія трывала замацавалі свае пазіцыі ў такім спецыфічным кірунку графікі, як карыкатура. Прыемна адзначыць, што сёлета ў адным шэрагу з кіроўнымі заканадаўцамі гумару правамерна размясцілася і наша Беларусь.

70 краін у асобе 590 мастакоў змагаліся за права ўвайсці ў разрад наймацнейшых дзяржаў свету ў галіне гумарыстычнай графікі. Міжнародная выстава карыкатуры, праведзеная ў Бельгійскім Kruishoutem у год 30-годдзя Еўрапейскага цэнтра карыкатуры, стала вынікам шматмесячнай працы арганізатараў гэтага праекта. Еўрапейскае журы ў складзе 10 чалавек вынесла свой вердыкт.

У адрозненне ад большасці выстаў, дзе звычайна даецца вольная тэма, альбо тэма з такім шырокім дыяпазонам, што ўяўляе фактычна дубляж папярэдняй, у Бельгіі кіруюцца іншым падыходам. Кожны раз арганізатары мерапрыемства прапаноўваюць аўтарам спаборнічаць у выяўленчым майстэрстве і досціпе на абсалютна розныя, часта нечаканыя тэмы для творчасці. У далёкім 1979-м — гэта «Кураня і яйка», летась — «Замкі і ключы», у цяперашнім юбілейным — «Пясок, галька, жвір». Мастакі ламалі галовы з нагоды будаўнічых матэрыялаў, іх ужывання, спосабаў здабычы і неабходнага абсталявання.

Малюнак Марыны ГАРЭЛАВАЙ.

Такім чынам, прапаноўваючы вузка спецыялізаваныя тэмы, прычым з розных сфераў жыцця, бельгійцы не даюць мастакам заседзецца, падштурхоўваюць спасцігаць і ствараць новае. Атрымліваецца, што ў выставе ўдзельнічаюць малюнкі «гарачыя», прама з-пад пяра аўтара. У арганізатараў ёсць магчымасць праверыць не толькі мастацкія, але і інтэлектуальныя здольнасці ўдзельнікаў. Такі падыход значна ўскладняе працу мастакоў, але затое дазваляе аб'ядноўваць людзей аператыўна думаючых, дасціпных, якія валодаюць шырокім далягляднасцю.

На суд спрактыкаванага журы кожны з мастакоў меў права вынесці 5 арыгінальных малюнкаў як у чорна-белым, так і каляровым выкананні. З 2500 карыкатур былі адабраныя 200, якія склалі экспазіцыю выставы. Старшыня Еўрапейскага цэнтра карыкатуры Рудзі Гейзенс адзначыў: «Хоць тэма, прапанаваная гэтым разам, апынулася цяжкай для шматлікіх карыкатурыстаў, абраныя карыкатуры — ашаламляльнай якасці». У гэты лік увайшлі і працы беларускага мастака-карыкатурыста, аўтаркі «Звязды» Марыны Гарэлавай, якія годна прадставілі нашу краіну на Міжнародным біенале ў Бельгіі, а адзін з яе малюнкаў быў уключаны ў выніковы альбом, складзены з 100 лепшых карыкатур 2009 года.

Ірына РАТНЕР.

ПАНЯДЗЕЛАК, 30 ЛІСТАПАДА

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.20 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.30 У свеце матораў.
9.10 Nota Bene.
9.40 «Зорныя танцы». «Жаночы сезон».
11.00, 17.25 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
12.10 Дэтэктыў «Мім Бім, або Чужое жыццё».
14.05 Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё». «Я веру толькі серыялам».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 «Культурныя людзі».
15.55 Здароўе.
16.25 Серыял «Сёстры па крыві».
18.25 «Даруй мне».
19.30 «Арэна».
19.55 Ток-шоу «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50 Спецыяльны рэпартаж «12+1».
22.05 Серыял «Часткі цела».
0.25 Дзень спорту.
0.40 Хакей для ўсіх.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20, 1.35 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.35, 1.50 Навіны спорту.
11.10 «Рэкламная паўза».
12.00 «Малахаў'+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.40 «Модны прыгавор».
14.45 «Кантрольная закупка».
15.15 Серыял «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева».
16.15 Ералаш.
16.45 «Бітва тытанаў».
18.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
22.15 Серыял «Марскі патруль-2». Закл. серыя.
23.40 «Злачынствы стагоддзя».
0.15 Серыял «Жанатыя... з дзецьмі».
0.45 Серыял «У захапленні ад цябе».

7.00 ЛАДная раніца.
8.00, 23.30 Серыял «Юрыкі».
8.30, 16.25 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
9.25 У гэты дзень.
9.30, 18.00 Серыял «Каханне як каханне».
10.30 Меладрама «Арфа для каханай».
12.00 «Пра мастацтва».
12.30 Школа рамонту.
13.20 Мультфільм.
13.35 Мультсерыял «Доктар Дог».
14.10 «Хачу ўсё ведаць».
14.25 Пазакласная гадзіна.
14.40 Бухта капітанаў.
15.20 Тэлебарометр.
15.35 Серыял «Камісар Мегрэ».
17.25 Простыя практыкаванні з Ю. Афанасьевым.
19.05 Дэтэктыў «Залатая міна». 1-я серыя.
20.40 «Калыханка».
20.55 Беларуская часінка.
22.00 Хакей. Формула гульні.
22.30 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
0.00 Серыял «На рагу ля Патрыяршых-3».

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30,19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.35 «Вялікае снеданне».
10.05 «Пяць гісторый».
10.40 Серыял «Анёл-ахоўнік».
11.45, 17.30 «Званая вячэра».
12.40, 18.30 Серыял «Былая».
13.50 «Зорны рынг».
15.05 «Далёкія сваякі».
15.30 «Гарачы лёд».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Я — падарожнік».
17.10 «Наша справа».
20.00, 22.55 «Сталічныя падрабязнасці».
20.20 «Добры вечар, малы».
20.30 Маст. фільм «Свае дзеці».
23.00 «Сталічны футбол».
23.30 «Гучная справа».
0.25 Серыял «Халасцякі».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05 «Разам».
6.05 «Цік-так».
6.20 Мультфільм «Болек і Лёлек».
6.30, 7.45, 9.35, 10.50 «Удачная пакупка».
6.40 Серыял «Біндзі: дзяўчынка з джунгляў».
7.30 Мультфільм «Волчище — серый хвостище».
7.55 «Білет на сёння».
8.05 «Лёгкае жыццё».
8.30 Серыял «Скрыжаванне».
9.45 «Садружнасць. LIVE».
10.05 Серыял «Вядзьмарскае каханне».
11.05, 23.05 Маст. фільм «Дым айчыны».
13.05 Мультсерыял «Джордж з джунгляў».
13.30 Серыял «Старшакласнікі».
14.05, 1.05 Серыял «Міліцэйская акадэмія».
14.30 «Смачны свет. Грузінская кухня».
15.20 «Дыялог з усім светам».
16.05, 3.50 Серыял «Ад'ютанты кахання».
17.05 Серыял «Разлучніца».
18.20 «Акцэнты».
18.30 Ток-шоу «Слова за слова».
19.30 Серыял «Гульні на выбыванне».
